Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ВЕРАСНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №173 (28537)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рагу з кабачка для... жыхароў заапарка**

СТАР. 4



**Экзамен на талент**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## БЕЗ САМАЗАСПАКОЙВАННЯ І АДТЭРМІНОВАК

### Прэзідэнт патрабуе адказна падрыхтавацца да II Еўрапейскіх гульняў

**На працягу многіх гадоў у нашай дзяржаве ствараецца сучасная спартыўная інфраструктура, будуюцца новыя гасцінічныя, забаўляльныя комплексы. Госці з усяго свету з задавальненнем едуць у Беларусь. Усё часцей наша краіна становіцца месцам правядзення чэмпіянатаў сусветнага ўзроўню. Вось і летась мы атрымалі ганаровае права прыняць у 2019 годзе галоўныя спартыўныя спаборніцтвы на кантыненце — другія Еўрапейскія гульні. Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў пашыранае пасяджэнне Нацыянальнага алімпійскага камітэта, падчас якога была абмеркавана падрыхтоўка да гэтага мерапрыемства.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# Птушка шчасця з Венеры



Дзмітрый КАЛЯГА з вёскі Венера Лагойскага раёна не першы год трымае на сваім двары райскую птушку — паўліна — і час ад часу паказвае яе цікаўным аднавяскоўцам. Шасцігадовая Марыя АКУЛІЧ, якая прыехала са сталіцы пагасціць у бабулі, напэўна, раскажа сваім сябрам пра жывую жар-птушку на звычайным вясковым падворку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Бізнес і вёска

## ЯК ЗРАБІЦЬ ЦУКЕРКУ З РАПСУ?

### Вырошчванне гэтай культуры пры навуковым падыходзе дае ад 350 да 400 долараў чыстага прыбытку з пасеянага гектара



**Закрытае акцыянернае таварыства «Аблрапсаграсэрвіс», якое знаходзіцца ў пасёлку Гарадзея Нясвіжскага раёна, змянілася за сем гадоў да непазнавальнасці. На месцы старых паўразбураных будынкаў была га райагрcounsэрвісу, выстаўленых калісьці на продаж, на яго тэрыторыі вырас сучасны завод па перапрацоўцы насення рапсу.**

### Было 5, стала 38

— Усё гэта запатрабавала салідных фінансавых укладанняў, рознага роду ўзгадненняў, без чаго рэалізаваць задуманае было б немагчыма. На пачатковым этапе інвестыцыйны праект быў разлічаны на 5 млн долараў. Але апетыт прыходзіць падчас яды. Уласнік палічыў свае выдаткі і прыбыткі і вырашыў укласці больш. Сёння агульная сума інвестыцый па праекце складае каля 38 млн долараў, — расказвае пра сваё дзецішча **дырэктар завода Пётр КУЛІК.**

Беларуска-літоўскае сумеснае прадпрыемства цешыць вока ўжо першым звяном — пры прыёмцы сыравіны. Прадпрыемства зараз прымае да 3,5 тысячы тон насення рапсу, а ў ідэале можа давесці гэтую лічбу да 5 тысяч тон. Пры ўездзе на завод стаяць аўтамабільныя вагі грузападымальнасцю 60 тон і даўжынёй платформы 18 метраў. Усё ўзважванне праходзіць у аўтаматычным рэжыме з пераносам інфармацыі на камп'ютар і афармленнем дакументаў. Дарэчы, на складзе прыёмкі зерня працуе два чалавекі.

СТАР. 4

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Мы плануем сабраць у грамадскім сектары сёння каля 7,9 млн тон збожжавых і зернебабовых. Акрамя гэтага, у нас яшчэ ёсць асабістыя падсобныя гаспадаркі, дзе намалот складзе 260 тыс. тон збожжа. У цэлым ураджай збожжавых чакаецца больш за 8,1 млн тон. Таксама маем намер забяспечыць валавы намалот алейнага семя ў памеры 730 тыс. тон. Чакаем добрага ўраджаю кукурузы сёлета. У канчатковым выніку гэта прынясе нам агульны каравай у 10 млн тон. Уборачная кампанія заканчваецца. Пры гэтым да завяршэння мы ідзём з перамогай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9234 | ▼ |
| Еўра | 2,3002 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0738 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# БЕЗ САМАЗАСПАКОЙВАННЯ І АДТЭРМІНОВАК

## НЕ ПАСЛУГА, А ГОНАР

Ужо спрагназаваны будучыя расходы. Па даных урада, яны складуць прыкладна 35—40 мільёнаў еўра. Для дзяржаўнага бюджэту гэтая сума адносна невялікая.

— Мы вырашылі, што гатовы падставіць плячо еўрапейскай алімпійскай сям'і і правесці дадзенае мерапрыемства, — адзначыў Прэзідэнт. — Пры гэтым з боку Еўрапейскага алімпійскага камітэта нам было абяцана ўсялякае садзейнічанне ў вырашэнні ўсіх пытанняў, а таксама рэсурсная і фінансавая дапамога. Не трэба думаць, што мы зрабілі нейкую паслугу еўрапейскай спартыўнай сям'і. Гэта перш за ўсё для нас дабро — тое, што Еўрапейскі алімпійскі камітэт даў нам права правядзення такога мерапрыемства.

Прайшло дастаткова часу, каб падвесці вынікі ўжо зробленага. Створаны Рэспубліканскі аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні другіх Еўрапейскіх гульняў на чале з прэм'ер-міністрам, падкамітэты па ўсіх кірунках і Дырэкцыя Еўрапейскіх гульняў. Да нас ужо прыязджаюць розныя групы экспертаў, кансультанты для абмеркавання дэталяў падрыхтоўкі Гульняў.

## ІНФРАСТРУКТУРА І БЯСПЕКА

У той жа час, прызнаўся кіраўнік дзяржавы, ёсць і насцярожваючыя фактары.

— Перш за ўсё, асноўнае пытанне: дзеля чаго мы ўсё гэта прыдумалі — краіна гэтымі Гульнямі яшчэ не жыве. Для каго мы праводзім гэтыя Гульні? Для нас з вамі, што сядзяць за гэтым сталом? Вымушае жадаць лепшага асвятленне ходу падрыхтоўкі Еўрапейскіх гульняў.

Наступная тэма — інфраструктура.

— Мяне інфармуюць аб адставанні ў падрыхтоўцы спартыўнай інфраструктуры і іншых аб'ектаў, — сказаў Прэзідэнт. — Якія праблемы, напрыклад, перашкаджаюць увесці ў эксплуатацыю мінскі стадыён «Дынама» ў 2017 годзе, як гэта прадугледжана адпаведным рашэннем Прэзідэнта? Усе цудоўна разумеюць, што нам трэба яшчэ пратэсціраваць з пункту гледжання лёгкаатлетычных спаборніцтваў, адпрацаваць цырымоніі адкрыцця і закрыцця Гульняў.

Што да прапановы ўрада перанесці на 31 снежня 2018 года тэрмін заканчэння рэканструкцыі спартыўна-стралковага комплекса ва Уручы, то Прэзідэнт заявіў:

— Адказваю на ўсе пытанні адразу: ніякіх прапаноў на маё імя аб пераносе тэрмінаў быць не можа. Усё, як вырашылі, павінна быць у тэрмін зроблена.

Спытаў Аляксандр Лукашэнка і пра тое, як ідуць справы з падрыхтоўкай гарадскіх службаў і інфраструктуры: гасцініц, інтэрнатаў, дарог, транспарту, месцаў грамадскага харчавання, турыстычных і гандлёвых аб'ектаў. Асобная тэма — бяспека.

— Як паказвае міжнародная абстаноўка, сёння гэта адна з ключавых праблем, — канстатаваў беларускі лідар. — Мы не павінны дапусціць і ценю сумнення ў надзейнасці Беларусі. Самае галоўнае тут — не самазаспакойвацца!

Патрабаванне кіраўніка дзяржавы: у пытанні арганізацыі гэтага буйнога еўрапейскага спартыўнага форуму дробязяў няма і быць не можа. Ад таго, як мы правядзём гэтыя Гульні, якія спартыўныя вынікі пакажам, як прадставім сябе ў Еўропе, на дзесяцігоддзі складзецца меркаванне пра Беларусь, пра наш народ.

## ПРАДУМВАЕМ ЗАГАДЗЯ

Прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй Кабякоў, які ўзначальвае Рэспубліканскі аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Другіх Еўрапейскіх гульняў, далажыў, што зроблена па падрыхтоўцы мерапрыемства ў плане бяспекі, транспартнага, медыцынскага абслугоўвання, харчавання. Так, адкрыццё Гульняў адбудзецца ў пятніцу 21 чэрвеня 2019 года, цырымонія закрыцця запланавана на нядзелю 30 чэрвеня 2019 года. Ён паведаміў, што ў рамках Гульняў чакаецца прыбыццё больш чым чатырох тысяч спартсменаў, каля дзвюх тысяч трэнераў і іншага абслугоўваючага персаналу, што прадстаўляюць афіцыйныя дэлегацыі з 50 еўрапейскіх нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. Прыедзе таксама прыблізна 650 міжнародных і 410 нацыянальных суддзяў па спорце, 1000 замежных прадстаўнікоў СМІ...

Спартыўныя спаборніцтвы пройдуць па 15 відах спорту. У праграме спаборніцтваў разыграецца 189 камплектаў медалёў у 23 спартыўных дысцыплінах.

Ужо вызначаны, праінфармаваў Андрэй Кабякоў, месцы правядзення спаборніцтваў, а таксама пражывання спартсменаў. Для пражывання віп-персон, гасцей і балельшчыкаў будзе задзейнічаны гасцінічны фонд сталіцы. Для пражывання непасрэдных удзельнікаў Гульняў (трэнераў і спартсменаў) задзейнічаюць комплекс «Студэнцкая вёска».

У краіну на час правядзення Гульняў чакаецца буйны прыток турыстаў. Таму важна, упэўнены прэм'ер-міністр, не дапусціць нематываваных накрутак цэн — каб у гасцей засталося добрае ўражанне ад краіны.

Што да харчавання спартсменаў, то гэта — сфера асаблівай адказнасці. Так, у прадуктах не павінна змяшчацца рэчываў, што могуць негатыўна паўплываць на выніку допінгавых тэстаў. Як адзначыў Андрэй Кабякоў, ужо ідзе падбор арганізацый, адказных за пастаўку ежы. Каб і спартсменам, і трэнерам, і турыстам было камфортна знаходзіцца ў Беларусі, падчас спаборніцтваў будуць працаваць валанцёры. Іх падбор ужо пачаўся.

## СПАРТСМЕН — ГЭТА ЛІДАР

Аляксандр Лукашэнка падчас нарады ўзняў шэраг праблемных пытанняў у плане падрыхтоўкі да Еўрапейскіх гульняў, зрабіў канкрэтныя даручэнні. Па-першае, сталіца павінна выглядаць годна. Трэба, каб усё было ўпарадкавана, і, галоўнае, даўгабудам у Мінску не месца:

— Прывядзіце горад у парадак, каб не было ніводнага даўгабуда. Ніякіх платоў, якія закрываюць гэтыя будоўлі, быць не павінна. Добраўпарадкаванне, знешнія фасады — усё павінна быць прыведзена да ладу.

У той жа час залішняя пампезнасць не патрэбна, ды і ўсё роўна мы не зможам перасягнуць адкрыццё Алімпіяды ў Сочы або першых Еўрапейскіх гульняў у Баку. Там толькі на адкрыццё і закрыццё былі ўкладзены сотні мільёнаў долараў... Пры неабходнасці і мы маглі б знайсці такія грошы, але, лічыць Прэзідэнт, гэта не патрэбна. Мы можам пабіць гэтыя рэкорды сваёй адкрытасцю, душэўнасцю.

Па-другое, краіна і на Гульнях, і ўвогуле на міжнародных спаборніцтвах павінна быць прадстаўлена на ўзроўні. Апошнім жа часам выступленні нашых спартсменаў не радуюць. На падрыхтоўцы спартсменаў, годных умовах для іх заняткаў дзяржава не эканоміць, але дзе аддача?

— У вас ёсць час для таго, каб перабудавацца, памяняць трэнераў, калі трэба, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі хочаце нешта заваяваць у спорце, трэба быць на галаву вышэй за іншых. Усе павінны быць безумоўнымі лідарамі. Попыт з кіраўнікоў федэрацый будзе самым жорсткім. Прыходзьце па грошы, калі будзе перспектыўны спартсмен і трэнер. Пад гэта грошы мы будзем выдзяляць, а потым патрабаваць вынік. І перастаньце спасылацца на нейкія перабудовы, змену пакаленняў.

Па-трэцяе, работа сродкаў масавай інфармацыі павінна быць больш якаснай па шэрагу кірункаў. У прыклад Прэзідэнт прывёў асвятленне ўборачнай кампаніі, калі дзякуючы журналісцкай працы ўвесь народ «жыў і перажываў, будзем мы з хлебам ці не». Гэтак жа трэба, упэўнены кіраўнік краіны, асвятляць і вучэнні «Захад-2017», і падрыхтоўку Еўрапейскіх гульняў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Парламенцкі дзённік

## У аснове — дружба і давер

### Дагаворную базу Беларусі і Таджыкістана варта дапоўніць дакументам аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве

**Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Таджыкістан у Беларусі Казідаўлатам КАІМДОДАВЫМ, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне.**

Па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў, беларуска-таджыкскія адносіны заўсёды развіваліся на аснове дружбы, узаемаразумення, падтрымкі і даверу. І важна, што супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі фарміравалася не толькі на высокім, але і на міжрэгіянальным узроўні. «Вельмі шмат заключана пагадненняў паміж нашымі абласцямі, Мінскам і Душанбэ. У цэлым, значна развілася дагаворна-прававая база. Усё ж такі 60 пагадненняў — гэта салідны пакет дакументаў. І я ведаю, што зараз яшчэ 11 падрыхтавана да падпісання восенню», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Аднак ён дадаў, што пагадненне аб супрацоўніцтве паміж парламентамі Беларусі і Таджыкістана дагэтуль не падпісана. Зацікаўленасць Таджыкістана ў заключэнні такога пагаднення ёсць — пра гэта было сказана ў перыяд правядзення летняй сесіі ПА АБСЕ ў Мінску, калі адбылася сустрэча беларускіх парламентарыяў з таджыкскім бокам.

Уладзімір Андрэйчанка выказаўся і наконт узаемнага тавараабароту. «У 2011 годзе ён склаў 73 мільёны долараў, потым усё неяк знізілася. Але радуе тое, што за першае паўгоддзе 2017-га ўзаемны тавараабарот вырас амаль у 2,5 раза», — дадаў парламентарый.

Спікер ніжняй палаты таксама звярнуўся да Казідаўлата Каімдодава і падзякаваў за шматгадовую працу. «Мы вельмі высока цэнім той уклад, які вы ўнеслі ў развіццё беларуска-таджыкскіх адносін за час працы паслом, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. — Я ўпэўнены, што дзе б вы ні працавалі па заканчэнні дыпламатычнай місіі ў Беларусі, вы заўсёды будзеце падтрымліваць нашу краіну, развіваць, умацоўваць тыя адносіны, якія склаліся ў нас за ўвесь гэты час».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by* ■

## ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ РАЗАМ

**У наступную суботу, 9 верасня, па традыцыі кіраўніцтва аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама правядзе прамыя тэлефонныя лініі.**

Так, на сувязь з 9.00 да 12.00 выйдуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Віктар Яўгеневіч САКОЎСКІ (80162213121);

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ (80212222222);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА (80232751237);

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ (80152735644);

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ (80222501869);

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ (80175004160);

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'яна МАТЭЛЬСКАЯ (80172224444).

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Столтэнберг: «Вучэнні «Захад-2017» не пагражаюць ні адной з краін НАТА»

Расійска-беларускія вучэнні «Захад-2017» не нясуць небяспекі непасрэдна ні адной з краін НАТА. Пра гэта заявіў генеральны сакратар альянса Енс Столтэнберг, які знаходзіцца ў Эстоніі.

«Мы будзем уважліва сачыць за ходам вучэнняў, але захоўваем спакой, бо не бачым непасрэднай пагрозы ні аднаму з саюзнікаў НАТА», — сказаў ён.

Раней у сераду Столтэнберг заявіў, што НАТА накіруе трох назіральнікаў на вучэнні «Захад-2017». «Мы атрымалі запрашэнне ад Расіі і Беларусі і адпраўляем трох экспертаў на вучэнні», — паведаміў ён. Пры гэтым ён заклікаў да вышэйшага ўзроўню транспарентнасці гэтых манеўраў.

### Прэм'ер Іспаніі: рэферэндуму аб незалежнасці Каталоніі не будзе



«Я даў указанне накіраваць у Канстытуцыйны суд іск супраць сепаратысцкіх рашэнняў каталонскіх улад са спасылкай на неканстытуцыйнасць», — адзначыў старшыня ўрада Іспаніі. «Рэферэндуму пра самавызначэнне не будзе», — запэўніў Марыяна Рахой.

«Тое, што адбылося ўчора (6 верасня — **Заўвага ТАСС**), — гэта акт ганебнага непадпарадкавання нашым дэмакратычным інстытутам, якія ўрад павінен абараняць, — адзначыў прэм'ер. — Мы ўсе абавязаны выконваць рашэнні Канстытуцыйнага суда».

Па словах Рахоя, кіраўнік Каталоніі Карлес Пучдэмон «ніколі не хацеў прыняць іншай магчымасці ўрэгулявання каталонскай праблемы, акрамя як рэферэндум».

«Можаце быць спакойнымі, ніхто не прымусіць вас рабіць нешта незаконнае, закон абароніць вас», — падкрэсліў Марыяна Рахой.

### Французы вярнулі выкрадзены 38 гадоў таму «Пежо»

Моцная засуха, што ўсталявалася гэтым летам у Еўропе, дазволіла французскім паліцэйскім раскрыць даўняе злачынства. А менавіта яны знайшлі скрадзены аўтамабіль.

Сіні Peugeot 104 прапаў у французскай правінцыі Шампань у 1979 годзе. Яго ўладальніца заявіла аб крадзяжы ў паліцыю, аднак знайсці транспартны сродак не ўдавалася на працягу амаль 40 гадоў. Увесь гэты час машына ляжала літаральна пад носам у праваахоўнікаў — на дне загленай сажалкі, якая сёлета аказалася без вады праз засуху.

Дзякуючы воднаму «кансерваванню» рарытэтная машына нядрэнна захавалася. На кузаве засталося лакафарбавае пакрыццё, а на бамперах — хром. Пад капотам пасяліліся сямейка ракападобных, якую вярнулі назад у вадаём. На жаль, у найбліжэйшай будучыні аўтамабіль наўрад ці пакатае сваю ўладальніцу. Жыхарка Рэймса, якую знайшлі дзякуючы архіўным даным, была здзіўленая знаходкай, якую ужо не разлічвала ўбачыць, і клопатам паліцэйскіх. Пакуль яна збіраецца як мінімум палюбавацца на сваю любіміцу.


## ДОПОЛНЕНИЕ И ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом №1 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» №152 (28516) от 10.08.2017**

**Дополнительно для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц предлагается 57 (пятьдесят семь) квартир, в том числе:**

- 19 (девятнадцать) 1-комнатных общей площадью 42,32 кв. м (квартиры №№121, 122, 125, 126, 134, 138, 142, 146, 150, 154, 158, 161, 162, 165, 166, 169, 189, 193, 197) и 1 (одна) 1-комнатная общей площадью 50,21 кв. м (квартира №163) стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 050 долларам США**;
- 30 (тридцать) 2-комнатных общей площадью от 57,72 до 62,24 кв. м (квартиры №№45, 49, 50, 57, 66, 69, 70, 74, 78, 123, 127, 129, 133, 135, 141, 143, 145, 147, 149, 151, 153, 155, 157, 159, 164, 180, 188, 190, 192, 196) стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 000 долларам США**;
- 7 (семь) 3-комнатных общей площадью от 74,0 до 78,56 кв. м (квартиры №№80, 83, 99, 115, 117, 119, 171) стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **950 долларам США**.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 20% стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься отделом ЖСПК, долевого строительства и аренды **с 15.09.2017**, понедельник с 8.30 до 17.30 (обед с 13.00 до 13.45), вторник с 8.30 до 13.00, среда с 13.45 до 17.30, четверг с 8.30 до 13.00 **по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел. (017) 234-16-98, (044) 795-44-44.**

УНП 192400611

## ■ Надвор'е

# БУДЗЕ ЯШЧЭ ЦЁПЛА

### У нядзелю сонейка прыгрэе месцамі да 27 цяпла

**Сёння на тэрыторыі краіны будуць гаспадарыць атмасферныя франты і няўстойлівая паветраная маса. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Але ў наступныя тры дні прыйдзе істотнае пацяпленне, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Удзень у асобных раёнах дажджы. Раніцай месцамі слабы туман. Вецер заходні, слабы да ўмеранага, днём парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад плюс 13 да плюс 19 градусаў. Атмасферны ціск будзе расці. У суботу прагназуецца паступленне больш цёплых паветраных мас на тэрыторыю краіны з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы павялічыцца да плюс 6—13 градусаў, а ўдзень чакаецца ад плюс 17 да 25 цяпла. Яшчэ больш цёплым абяцае стаць 10 верасня. У нядзелю надвор'е па-ранейшаму будзе пад уплывам цёплых і няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы. У асобных раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы, удзень магчымы навальніцы. Уначы і раніцай слабы туман. Да нас вернецца амаль летняе надвор'е. Уначы тэмпература паветра чакаецца плюс 9—16 градусаў, а ўдзень ад 19 цяпла па паўночным усходзе да плюс 27 градусаў па поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

### ❍ Факт

### ВЕРАСНЁВАЯ АКТЫЎНАСЦЬ СОНЦА

**Успышка на Сонцы, якая адбылася ў мінулую сераду, стала самай буйной за апошнія 12 гадоў, гаворыцца ў паведамленні лабараторыі рэнтгенаўскай астраноміі Сонца Фізічнага інстытута імя Лебедзева РАН (ФІАН).**



Успышцы 6 верасня прысвоены бал X9.3 — апошняя ўспышка такой сілы назіралася 7 верасня 2005 года. Па словах экспертаў, ім яшчэ трэба будзе зразумець, як такая магутная ўспышка магла адбыцца на фоне мінімуму сонечнай актыўнасці.

«У найбліжэйшыя суткі даследчыкам трэба разабрацца, што будзе з Зямлёй і яе касмічнымі наваколлем да канца гэтага тыдня, бо выбух адбыўся ў геаэфектыўнай зоне паблізу лініі Сонца — Зямля, адкуль уздзеянне Сонца на нашу планету з'яўляецца максімальным», — гаворыцца ў паведамленні.

У ФІАН адзначаюць, што ўзровень успышкавай актыўнасці ў цяперашні момант перавышае значэнне 10 (дакладны бал — 10,3). Такое значэнне знаходзіцца ўжо за межамі звычайнай каляровай шкалы, якая налічвае пяць значэнняў (ад зялёнага да жоўтага, аранжавага, чырвонага і максімальнага, фіялетавага, узроўняў актыўнасці Сонца) і адпавядае так званаму чорнаму, найвышэйшаму ўзроўню актыўнасці.

## СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ Ў ТЭХНАЛАГІЧНЫМ

**500-годдзе беларускага кнігадрукавання працягвае заставаццца актуальнай тэматычнай прасторай для абмеркавання і ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях.**

Учора завяршыў сваю работу двухдзённы Міжнародны форум — трэці па ліку — «Скарынаўскія чытанні 2017: кніга ў медыйнай прасторы» ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Праводзіцца ён на базе факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый. З прывітальным словам перад удзельнікамі форуму выступіў намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч.

Удзел у рабоце «Скарынаўскіх чытанняў 2017» прынялі навукоўцы з розных ВНУ як Беларусі, так і Расіі — з Калугі, Томска, Санкт-Пецярбурга; Украіны — Кіева, Львова; Польшчы. Прыемна, што вялікую ўвагу выступоўцы ўдзялілі асаблівасцям беларускага нацыянальнага кнігадрукавання, разгледзелі тэндэнцыі развіцця айчыннай кніжнай справы ў апошнія дзесяцігоддзі. Уражальнай грунтоўнасцю сярод іншых агучаных тэм вылучаецца даклад кандыдата педагагічных навук, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва Ларысы Доўнар «Кнігадрукаванне Беларусі ў святле статыстыкі (2008—2016 гг.)». Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт БДТУ Алег Барашка прадставіў канцэпцыю ўнікальнага бібліяфільскага выдання «Багемны Мінск у сілуэтах». Даследчык і выдавец з Польшчы Грэгаж Вількаш пазнаёміў удзельнікаў чытанняў з тэмай «Праблемы камунікацыі ў сучасным свеце: новыя тэхналогіі навучання замежным мовам». Сярод іншага сімпатычнай падаецца і такая тэма чытанняў — «Літаратурны турызм: па краінах і кантынентах з персанажамі дзіцячай літаратуры», якую прэзентавалі навучэнкі гімназіі №1 імя У. Караля горада Чэрвеня Ганна Новікава і Надзея Янкоўская. Усяго на форуме прагучала каля 100 дакладаў і выступленняў.

**Сяргей ШЫЧКО.** *shychko@zviazda.by*

## ■ Эканоміка

# ДЫЯЛОГ БІЗНЕСАЎ

### Восем трактароў паедуць у Інданезію

**«Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў» упершыню прадставіў кампактны трактар «Беларус-320Р» на міжнароднай выстаўцы сельскагаспадарчай тэхнікі InAgriTech-2017.**

Машына створана спецыяльна для работы ў цяжкіх умовах краін Паўднёва-Усходняй і Паўднёвай Азіі на рысавых палях. Акрамя бабруйскага трактара, на беларускім стэндзе наведвальнікі маглі пазнаёміцца яшчэ з дзвюма мадэлямі беларускай тэхнікі: трактарамі «Беларус-1523Т.3» і «Беларус-892.2» вытворчасці МТЗ.

Арганізатары стэнда адзначылі, што падчас выстаўкі наведвальнікі маглі не толькі паглядзець на тэхніку, але і правесці тэст-драйв любога трактара на пляцоўцы перад выставачным комплексам. Па словах прадстаўнікоў кампаніі, нягледзячы на высокую канкурэнцыю з вядучымі сусветнымі трактарнымі брэндамі, якія таксама прадстаўлялі сваю прадукцыю, Бабруйскі завод расцэньвае свае перспектывы па замацаванні на мясцовым рынку як даволі высокія. Пацвярджэннем таму можа служыць заяўка на пастаўку ў Інданезію 8 трактароў, якую кампанія атрымала пасля завяршэння мерапрыемства.

Выстаўка InAgriTech-2017 ужо пяты раз праходзіла ў сталіцы Інданезіі — Джакарце. У найбуйнейшай у краіне спецыялізаванай аграгэхнічнай экспазіцыі прынялі ўдзел больш за 500 экспанентаў з 18 краін.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

## ■ За бег!

# Перамагчы можа нават балельшчык

### Што чакае гасцей і ўдзельнікаў Мінскага паўмарафону

**У гэту нядзелю ўдзел у ім прымуць больш за трыццаць тысяч удзельнікаў з розных краін. Першы забег па цэнтры горада на дыстанцыі 5 і 10 кіламетраў пачнецца ў 10 раніцы, другі — на 21 кіламетр — у 12.30.**

Упершыню Мінскі паўмарафон, прымеркаваны да Дня горада, правялі ў 2013 годзе, — і за чатыры гады ён разросся да знакавай міжнароднай падзеі. Стартавая пляцоўка па традыцыі размесціцца каля Палаца спорту. Па сутнасці, удзельнікі будуць бегчы вакол Свіслачы. Ад праспекта Машэрава ў бок плошчы Перамогі, па праспекце Незалежнасці да Бабруйскай вуліцы і адтуль назад да старту. Самыя вынослівыя змогуць пазмагацца за галоўны прыз — тры тысячы долараў за перамогу на самай доўгай дыстанцыі. Аднак калі ваша мэта не перамога, а ўдзел, то можна пастарацца запомніцца не хуткасцю, а яркім касцюмам — выбіраць найлепшых будуць у дзясятцы розных намінацый. Нават у балельшчыкаў ёсць шанц атрымаць свой прыз. Яны таксама могуць прыдумаць незвычайны строй ці падрыхтаваць плакат у намінацыях: самы вялікі, матывуючы ці высокамастацкі. Для заядлых карыстальнікаў сацыяльных сетак ёсць асобнае спаборніцтва — конкурс відэа на тэму «Як я рыхтуюся да Мінскага паўмарафону».

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### РЭЗЕРВЫ БЕЛАРУСІ — АМАЛЬ 7 млрд ДОЛАРАЎ

**Золатавалютныя рэзервы Беларусі, у адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду, на 1 верасня склалі 6,993 млрд долараў у эквіваленце.**

Міжнародныя рэзервовыя активы нашай краіны за жнівень выраслі на 328,8 млн долараў (на 4,9%) пасля росту сёлета ў ліпені на 103,8 млн долараў (на 1,6%). За студзень—жнівень прырост рэзерваў склаў 2066 млн долараў (42%).

Істотнаму павелічэнню золатавалютных рэзерваў у жніўні спрыялі паступленні сродкаў у замежнай валюце ў бюджэт, уключаючы экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты. А таксама павелічэнне аб'ёму сродкаў у замежнай валюце на карэспандэнцкіх рахунках банкаў у Нацбанку, павелічэнне кошту манетарнага золата, паступленне сродкаў ад продажу Нацбанкам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, і купля рэгулятарам замежнай валюты на таргах БВФБ.

У жніўні ўрадам і Нацбанкам пагашана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 135 млн долараў. Летась золатавалютныя рэзервы нашай краіны ў вызначэнні МВФ павялічыліся на 751 млн долараў (на 18%) — да 4 927,2 млн долараў (у эквіваленце) на 1 студзеня 2017 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### РЭАБІЛІТАЦЫЯ ПОБАЧ З ДОМАМ

**У Мінску адкрылася аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў.**

Новае аддзяленне адкрылася на базе тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна (вуліца Ясеніна, 141). Яно разлічана на адначасовае знаходжанне 15 маладых людзей з цяжкай інваліднасцю.

Аддзяленне абсталявана спецыяльнымі медыцынскімі ложкамі, эрганамічнай і бескаркаснай мэбляй. А ў пакоі псіхалагічнай разгрузкі мяккімі зрабілі не толькі крэслы, але і сцены. У штатны расклад уключаны два спецыялісты па сацыяльнай рабоце, два кіраўнікі гуртка і малодшая медыцынская сястра.

— У сваёй рабоце спецыялісты будуць праводзіць рэабілітацыйныя мерапрыемствы з выкарыстаннем сучаснага абсталявання і прымяненнем перадавых метадык — музыкальнай, цялеснай, арт-тэрапіі, сенсорнай стымуляцыі і інтэграцыі, альтэрнатыўнай камунікацыі, — паведаміла **дырэктар ТЦСАНа Алена ДЗЯМІДАВА.**

Паслугі ў аддзяленні будуць аказвацца ў будныя дні з 8 да 18 гадзін.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

### ПЯЦЬ БЕЛАРУСАЎ ЗАГІНУЛІ НА СМАЛЕНШЧЫНЕ

**У Смаленскай вобласці адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, ахвярамі якога сталі пяць нашых суайчыннікаў.**

Па інфармацыі тамтэйшых праваахоўнікаў, аварыя адбылася ноччу на 182-м кіламетры трасы М1 Масква—Мінск. Сутыкнуліся два грузавікі і мікрааўтобус з пасажырамі. У бок Масквы рухаўся вялікагруз па перавозцы шчэбню. За ім ехаў іншы грузавік. Ён і ўрэзаўся ў вялікагруз, пасля чаго ад удару яго вынесла на сустрэчную паласу. Там грузавік сутыкнуўся з мікрааўтобусам, у якім ехалі восем грамадзян Беларусі. Пяць з іх загінулі на месцы. Кіроўца і пасажыр мікрааўтобуса былі шпіталізаваныя. Не пацярпеў толькі адзін з тых, хто знаходзіўся ў салоне: ён накіраваўся дадому. Дарэчы, кіроўца гэтага грузавіка, які вынесла на сустрэчную паласу, — таксама грамадзянін Беларусі.



smoldaily.ru

### ГУЛЬНЯМАН УКРАЎ 2 ТЫСЯЧЫ ДОЛАРАЎ

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС сталіцы затрымалі беспрацоўнага 41-гадовага жыхара Барысава, які ў сваёй знаёмай украў дзве тысячы долараў.**

Па інфармацыі аператыўнікаў, мужчына мае гульнявую залежнасць. Нават нягледзячы на тое, што ён не працуе, на гульнявыя аўтаматы грошы знаходзіў заўсёды. У асноўным, браў у 46-гадовай сужыцелькі, іншым разам пазычаў у яе дачкі.

Заўважыўшы аднойчы, дзе сужыцелька хавае свае зберажэнні, вырашыў частку з іх — дзве тысячы долараў — узяць на свае патрэбы. Пасля чаго з'ехаў у Барысаў, дзе абмяняў грошы і неўзабаве ўсё патраціў у той жа дзень на гульнявых аўтаматах. Жанчына ж, заўважыўшы прапажу грошай, звярнулася ў міліцыю. Падазронні палі на яе сужыцеля, у адносінах да якога заведзена крымінальная справа за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ■ На сцэне

# Спачатку — «Травіята»

### Дзеянне пастаноўкі перанесена ў сучасны Парыж, а галоўная гераіня хварэе на рак

**Гэта адбудзецца сёння: адкрыццё 85-га сезона ў Вялікім тэатры і прэм'ера оперы «Травіята» Джузэпэ Вердзі, рэжысёрам якой стаў латвіец Андрэйс Жагарс.**

Опера ў нейкім сэнсе паўтарыла лёс сваёй першакрыніцы — рамана Аляксандра Дзюма малодшага «Дама з камеліямі». Раман, з куртызанкай у якасці галоўнай гераіні, быў прызнаны амаральным, але ў той жа час стаў хітом і перайшоў у лік абсалютных шэдэўраў сусветнай літаратуры. Першы варыянт «Травіяты» Джузэпэ Вердзі чакала нешта падобнае — першапачатковае фіяска і ўсё ж такі статус адной з найвядомейшых і найпапулярнейшых у тэатральным рэпертуары опер. У адным толькі беларускім Вялікім яна ставіцца ўжо шосты раз.

І новая пастаноўка апелюе ўжо не да XIX стагоддзя, а да сучаснасці, таму, напрыклад, хваробай, ад якой памірае галоўная гераіня, становіцца не туберкулёз, а рак. Андрэйс Жагарс праанансаваў, што «Травіята» ў яго інтэрпрэтацыі для нашага тэатра будзе ў першую чаргу казаць пра «публічную адзіноту».

У распачатым сёння новым сезоне Вялікага тэатра апроч «Травіяты» адбудзецца яшчэ тры прэм'еры: балетмайстар Марыінскага тэатра Санкт-Пецярбурга Вячаслаў Хамякоў прадставіць балет «Карсар», Міхаіл Панджавідзэ паставіць «Тоску» Джакома Пучыні, Аляксандр Ціцэль — «Багему» зноў жа Пучыні. Генеральны дырэктар тэатра Уладзімір Грыдзюшка паабяцаў таксама, што ў будучым сезоне захаваюцца традыцыйныя мерапрыемствы — Калядны оперны форум, Калядны конкурс вакалістаў, Вялікі калядны баль і Балетнае лета ў Вялікім.

Прэм'ерныя паказы «Травіяты» тым часам адбудуцца сёння, 8-га, і 10 верасня.

**Сафія КІСЯЛЁВА**

■

■ Добрая справа

# ПАЧАСТАВАЦЬ ПРАДУКТАМІ СА СВАЙГО ЎЧАСТКА... МЯДЗВЕДЗЯ ЦІ ЗЕБРУ

### Мінскі заапарк ведае, каму спатрэбіцца лішкі ўраджаю



**Восень спрадвеку была любімай парой беларусаў: палеткі ўбраны, засекі даверху напоўнены запасамі, час адпачываць і спраўляць вясёлыя святы. Аднак, як аказалася, гэты перыяд прыносіць свае радасці не толькі людзям, але і братам нашым меншым, якія нарадзіліся або пераехалі на пастаяннае месца жыхарства ў беларускую сталіцу. Бо ім дастаюцца свежыя прысмакі наўпрост з садоў і агародаў спагадлівых жыхароў і гасцей горада.**

## Ад яблыкаў да шышак і галінак

Падобную акцыю Мінскі заапарк праводзіць ужо трэці раз. І справа, як запэўніваюць супрацоўнікі, зусім не ў тым, што жывёл няма чым карміць. Гэта спосаб прыцягнуць людзей да агульнай карыснай дзейнасці. А сапраўды, пасля таго, як усе магчымыя рэцэпты пірагоў апрабаваны, закаткі зроблены, а ўсе знаёмыя забяспечаны стратэгічным запасам садавіны, многія не ведаюць, куды падзець усё яшчэ нявыкарыстаныя дзясяткі кілаграмаў тых жа яблыкаў. Выйсце ёсць — аднесці іх у заапарк.

Спіс прадуктаў, якія гарманічна ўпішуцца ў рацыён жывёл, даволі шырокі. Прымаюць да 30 верасня ягады, садавіну, грыбы, галінкі. У тым ліку яблыкі, бульбу, гарбузы, кабачкі, яловыя шышкі з насеннем, сланечнікі, брусніцы, журавіны, вінаград, кукурузу ў пачатках. Скарапсавальных прадуктаў бяруць не больш за 5 кілаграмаў ад чалавека, а па гародніне, якая можа захоўвацца месяцамі, абмежаванняў няма. Дарэчы, сёлета ахвотней за ўсё дзеляцца менавіта кабачкамі. Але, як заўважыла



метадыст заапарка Наталля **СІКОРЫНА**, пік актыўнасці пакуль не наступіў, шмат у каго даходзяць да гэтага рукі толькі ў верасні пасля канчаткова завяршэння ўсіх «палявых» работ.

І ўсё ж нават самым шчодрым дарыльшчыкам не варта ўяўляць сябе ў ролі наглядчыкаў. Такога, што вы прыносіце пакет яблыкаў і тут жа з ім накіроўваецеся да вальераў, не будзе. Усе прадукты праходзяць дбайную праверку і толькі пасля гэтага трапляюць «на стол» да насельнікаў заапарка. Дарэчы, ва ўсіх іх збалансаваны рацыён і даволі строгі рэжым харчавання. За працэсам можна толькі паназіраць: на сайце заапарка ёсць расклад паказальнага кармлення розных жывёл.

## «Закантачыцца» з козачкамі і баранчыкамі

Калі ўсё ж жаданне далучыцца да жывой прыроды праз падзел трапезы непераадольнае, можна адправіцца ў кантактны куток. Акрамя таго, што жывёл тут можна пагладзіць, зрабіць з імі радаснае сэлфі, іх яшчэ можна і пакарміць. Праўда, пачастункі, якія прыводзяць у захапленне дзяцей, накшталт марожанага або цукровай ваты, у гэтым выпадку не падыдуць. Козлікі з баранчыкамі, верагодна, праглынуць іх з цікавасцю, але карысці ім гэта дакладна не прынясе. Правераны корм для жывёл — кавалачкі яблыкаў і морквы — можна за сімвалічную суму купіць паблізу. За праблему пераядання турбавацца не варта, у кантактным кутку жывёлы мяняюцца некалькі разоў на дзень — іх «рабочая» змена доўжыцца значна менш традыцыйных звыклых нам васьмі гадзін.

Не ўтрымалася ад спакусы пазнаёміцца з жывёламі бліжэй і Аліса Зайцава, якая разам з бацькамі і братам прыехала з Віцебска. Да нясмела працягнутай рукі дзяўчынкі спачатку асцярожна падыходзіць адзін козлік, але, калі становіцца зразумелым, што небяспека тут не пагражае, вакол скапліваецца цэлы міні-статак. Не дзіўна, што гэта самая шумная частка заапарка: тут гучыць як дзіцячы смех, так і воклічы здзіўлення з прычыны занадта актыўнага жадання жывёл мець зносіны. Сям'я Зайцавых выбарам вольнага часу ў сталіцы засталася задаволеная — самае тое, каб зарадзіцца станоўчымі эмоцыямі перад пачаткам навучальнага года.

## Усёедны мядзведзь, які любіць прымаць ванну

У Мінскім заапарку маецца каля 400 відаў жывёл, усяго дзве тысячы асобін. І ў кожнага — свае звычкі як у ежы, так і ў ладзе жыцця. Напрыклад, папугаі і малпы ўпадабалі шышкі з семкамі: для іх гэта не толькі ежа, але і займальная цацка. А вось буры мядзведзь у прынцыпе любіць паесці, ніколі не адмаўляецца ні ад якіх страў. А яшчэ ён любіць праводзіць час з камфортам: самая лепшая летняя забаўка — паплюхацца ў ванне з прахалоднай вадой. Цяжэй за ўсё дагадзіць тым жа малпам: яны могуць адмаўляцца ад той ці іншай ежы са сваіх асабістых смакавых пераваг. Сапраўднай зоркай заапарка можна назваць белага тыгра, ён ад душы любіць пакрасавацца і большую частку часу праводзіць падлашчваючыся да наведвальнікаў.

Каб у вальерах не было ніводнай галоднай, а значыць незадаволенай, жывёлы, працуе кармакухня, многія прадукты праходзяць тэрмічную апрацоўку, так што атрымліваюцца амаль цалкам звыклыя нам стравы, як, напрыклад, рагу з кабачкоў. Дарэчы, прадукты гараджан могуць апынуцца не толькі ў птушак, малпаў, парнакапытных ці зуброў, але нават і ў драпежнікаў — для ўмацавання імунітэту ім таксама перыядычна дадаюць у ежу «зеляніну». Ужо хутка рацыён жывёл, асабліва тых, хто шмат часу праводзіць на вуліцы, будзе ўзмоцнены: ім неабходна набіраць тлушчавую масу, каб без праблем перанесці будучыя халады.



А вось тых, хто падзяліўся лішкамі свайго ўраджаю, зможа сагрэць думка пра тое, што вынікамі іх працы пачаставаліся, магчыма, самыя экзатычныя жывёлы.

Пры жаданні заапарку можна дапамагчы не толькі прадуктамі, але і асабістым удзелам: валанцёрам тут заўсёды рады. Тым больш, у планах пашырэнне — ужо пачалі рэканструяваць старую частку парку, дзе знаходзіцца маляўнічы масток.

Тых жа, хто пакуль гатовы толькі назіраць збоку, запрашаюць правесці ў заапарку Дзень горада. 9 верасня тут разгорнецца канцэртная праграма, пройдзе спаборніцтва ўдзельнікаў гуртка верхавой язды, паказальнае выступленне клуба спартыўнай сабакагадоўлі і выстава дробных жывёл і грызуноў.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*



# ЯК ЗРАБІЦЬ ЦУКЕРКУ З РАПСУ?

## З аўтаматыкай на роўных

Сэрца прадпрыемства — сучасны цэх па перапрацоўцы насення рапсу метадам гарачага прасавання, які працуе ўжо практычна на поўную магутнасць. Новае абсталяванне ў параўнанні з мінулым у тры разы больш прадукцыйнае. Але што вельмі важна — усе працэсы зараз цалкам аўтаматызаваныя. Таму прысутнасць у цэху чалавека не абавязковая. Як працуюць установкі, сочыць аператар.

З суседняга пакоя праз шкло яму выдатна відаць увесь аўтаматычны рыштунак, а па камп'ютары ён адсочвае стан кожнага механізма і ўвесь вытворчы працэс. Тут чыстае паветра, практычна не чуваць, як працуе ўвесь гэты складаны канвеер. Прадукцыйнасць цэха 500—550 тон у суткі. На працягу года гэта прыкладна 180 тысяч тон.

— Зерне рапсу паступае на прэс, пасля чаго мы атрымліваем рапсавы алей і жмых. Алей папярэдне чысціцца і паступае на склад, — расказвае **начальнік цэха Віктар СТРУКОВІЧ**. — У цэху чатыры змены, на якіх працуе ўсяго па два чалавекі.

Абсталяванне, дарэчы, нямецкае. Прапаноўвалі да яго і комплекс праграмнага забеспячэння. Але нашы спецыялісты падключылі комплекс у сістэму самастойна.

## Пад крылом — 50 тысяч га

Уборка рапсу ў сыравінавай зоне прадпрыемства пачынаецца практычна аднachасова. Таму пабудавалі дастаткова складскіх памяшканняў арачнага тыпу і тры сіласы аб'ёмам 10 000 кубічных метраў, каб прымаць сыравіну без затрымак. Умяшчальнасць кожнага складскога памяшкання арачнага тыпу — дзве з паловай тысячы тон, а кожнага сіласу — сем тысяч тон насення рапсу. На поўную магутнасць працуе айчынны зернесушыльны комплекс.

— Каб атрымліваць сыравіну ў дастатковай колькасці, наша кампанія ўжо не адзін год вядзе работу па забеспячэнні гаспадарак найлепшымі насеннем, высокаэфектыўнымі найноўшымі сродкамі абароны раслін, — працягвае Пётр Кулік. — Таму на поспех можна разлічваць толькі пры цесным супрацоўніцтве і з аграрнай навукай, і з вытворцамі.

— Нас падтрымліваюць улады, — адзначае **старшыня савета дырэктараў ЗАТ «Аблрапсаграсэрвіс» Аляксандр КАРПЕЧАНКА**. — Літаральна днямі ў губернатара была распрацавана і зацверджана праграма па вырошчванні рапсу. Кіраўнік вобласці вырашыў падтрымаць ініцыятыву з месцаў і адмовіцца ад спецыфікі лабіравання інтарэсаў выключна дзяржаўных прадпрыемстваў. Пастаўкі рапсу будуць ажыццяўляцца строга па схеме выйграных тэндараў і аўкцыёнаў. А яшчэ мы разлічваем, што каля 50 тысяч гектараў рапсу будзе вырошчвацца пры нашым непасрэдным удзеле. Цяпер распрацоўваюцца юрыдычныя тонкасці гэтага рашэння.

## Алей да бутэлечкі

Усю атрыманую прадукцыю прадпрыемства адпраўляе не толькі на ўнутраны, але і знешні рынкі. Калі рапсавы шрот цалкам ідзе айчыннаму спажыўцу, то вялікая частка алею пастаўляецца ў Літву. Такім чынам завод зарабляе валюту.

Ёсць у завода і больш далёкія планы і перспектывы. Напрыклад, рабіць у Гарадзеі алей рапсу і разліваць яго па бутэльках — фасаваць у канчатковую тару для продажу. Але так ужо робяць іншыя, а ствараць штучную канкурэнцыю не хацелася б. Вось калі б на такі алей з'явіўся ўстойлівы попыт унутры краіны і за мяжой, спадзяюцца вытворцы. Паміж справай, цяпер прапрацоўваецца магчымасць пастаўкі рапсавага алею ў Ізраіль. Напрамак цікавы, толькі не спрацоўвае пытанне цаны. Калі б у беларускага вытворцы атрымалася паменшыць сабекошт, тады гэты рынак быў бы для нас адкрыты.

Іншым перспектыўным напрамкам з'яўляецца ўзбагачэнне шротаў бялком, іншымі мінеральнымі дабаўкамі. У гэтым выпадку наш корм будзе значна лепшы, чым у канкурэнтаў, і будзе даваць вялікую аддачу сельгаспрадпрыемствам па малацэ і прыбаўленні ў вазе.

А вяскоўцам і сапраўды выгадна займацца гэтай культурай. Па словах Аляксандра Карпечанкі, сёння рапс адзін з высокарэнтабельных і грашовых культур. Менавіта вырошчванне рапсу пры навуковым падыходзе дае ад 350 да 400 долараў чыстага прыбытку з гектара пасеваў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**...Некалькі дзяўчат распяваюцца пад вокнамі, а крыху старэйшая за іх «калега» ў яркім сцэнічным уборы робіць сэлфі на ганку, пакуль унутры гамоняць, выконваюць артыкуляцыйныя практыкаванні, чакаюць сваёй чаргі і неверагодна хвалююцца дзясяткі іншых прэтэндэнтаў. На чатыры дні ў пачатку верасня Беларуская акадэмія музыкі ператварылася ў экзаменацыйны цэнтр для адораных дзяцей і падлеткаў з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама іх бацькоў і педагогаў. Тут прадстаўнікі канала АНТ і запрошаныя эксперты праводзілі кастынгі юных вакалістаў, інструменталістаў, танцораў і артыстаў арыгінальнага жанру — будучых удзельнікаў тэлепраекта «Талент краіны—2». Журналісты «Звязды» пабывалі ў закуліссі адбору сёлетняга шоу.**



■ За кадрам

# АДВАЖВАЙЦЕСЯ — ВЫ ТАЛЕНАВІТЫЯ!

У Мінску прайшоў адбор на творчы тэлеконкурс «Талент краіны—2»



## І Ў ГІПСЕ, І ЦЕРАЗ ЧОРНЫ ХОД

Сёлета свае таленты на суд адборачнага журы вынеслі каля 500 прэтэндэнтаў. Геаграфія ўражвае: Бабруйск, Мазыр, Гродна, Мінск, Магілёў, Старыя Дарогі, Жодзіна, Гомель...

Традыцыйна самая вялікая канкурэнцыя — сярод вакалістаў, якіх на кастынг сабралася некалькі сотняў, прычым абсалютная большасць — дзяўчаты. Але духу барацьбы мы не адчулі, як ні стараліся — можа, гэта самі сцены Акадэміі музыкі настройвалі ўдзельнікаў на мірны і творчы, а не агрэсіўна-спаборніцкі лад? Вось у закутку хола дзяўчаты-падлеткі дапамагаюць адна адной прымацаваць да касцюма парадкавыя нумары, а вось пад самымі дзвярыма аўдыторыі, дзе засядае строгае журы, малеча наладзіла гульню ў «чы-чы-по» (адна з разнавіднасцяў «камень-нажніцы-папера»). Зрэшты, і журы аказалася не такім ужо строгім, у чым мы таксама пераканаліся, зазірнуўшы ў «судовыя залы». Практычна кожнага ўдзельніка суддзі — вядомыя артысты, кампазітары, выкладчыкі музыкі, тэлевізійныя прадзюсары — стараліся не толькі праслухаць, але і падбадзёрыць, разняволіць, разагрэваць.

— Што ў цябе з рукой? — здзівілася журы, убачыўшы 9-гадовую мінчанку Машу Мойсак з гіпсам.

— Каталася на веліку, і там камень раптам выскачыў, а я затармазіць не паспела, і вось так упала, цяпер у школу не хаджу, урач забараніў, каб не штурхнулі выпадкова і косці не зрушыліся! — на адным дыханні выпаліла дзяўчо.

— У школу не пайшла, а да нас змагла? — падкалолі дарослыя.

— Так! — не разгубілася малая. — Я яшчэ летась была на кастынгу разам з адным фокуснікам, ён мой сябар, і вельмі захацела сама паспрабаваць, так што сёння, можна сказаць, мой дэбют, — і гэтак, не збаўляючы абаротаў, Маша выдала жвавую песеньку, пад якую некаторыя суддзі нават пачалі прытанцоўваць.

Іншая мінская школьніца ўразіла прабіўной сілай: нягледзячы на тое, што дзяўчыне ўжо споўнілася 16 гадоў — і значыць, па ўмовах конкурсу яна не можа трапіць у праект, — прайшла на кастынг літаральна праз чорны ход, каб выдаць рок. «Вельмі ўжо хацела да вас трапіць», — прызналася дзяўчына. — «Падрабляйце пашпарт», — напаўжартам параіў у адказ кампазітар Леанід Шырын.



Сваю порцыю добрых слоў за імпэт, харызму і байцоўскі характар дзяўчына атрымала, а пуцёўку ў эфір — не: правілы ёсць правілы.

Вакалісты спрабавалі ўзяць хто чым: адны выбіралі эфектныя сцэнічныя вобраз, другія — цікавы рэпертуар, замахваючыся на кампазіцыі Адэль і Вольгі Кармухінай, урыўкі з аперэт і старыя савецкія хіты. Некалькі ўдзельнікаў, выпадкова ці наўмысна, выконвалі песні членаў журы — у прыватнасці, сёлетні «еўравізійны» хіт гурта Naviband. «Гэта вельмі нязвыкла — чуць сваю песню збоку, у іншым выкананні», — крыху збянтэжана прызналіся Ксенія Жук і Арцём Лук'яненка, яшчэ не ведаючы, што за дзвярыма гараняць звонкае «Хэй, хэй!» і іншыя кандыдаты...

«Сярод удзельнікаў-вакалістаў вельмі многа «народнікаў» і мала акадэмічнага вакалу, — адзначае **кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ.** — Вельмі цікава, што многія самыя маленькія артысты даюць фору старэйшым удзельнікам сваёй адкрытасцю, шчырасцю, упэўненасцю і разняволенасцю. А ў падлеткаў ужо ёсць паняцце фармату, яны прыпадабняюцца да папулярных артыстаў і не даюць разглядзець саміх сябе... Што яшчэ хочацца адзначыць — выбар рэпертуару. Часта на дзіцячых конкурсах ён адзін і той жа, нават праз дзесяць гадоў гучаць тыя самыя песні, многія з якіх сучасныя дзеці ўжо не разумеюць. І на гэтым фоне выразна бачна тых, хто свядома абраў музыку, хто плануе звязаць з гэтым жыццё, — у іх зусім іншы падыход, разуменне таго, якая вялікая праца наперадзе».

«Мне прыемна бачыць на кастынгу дзяцей з эмацыянальнай падачай і глыбокім разуменнем таго, што яны робяць, — дадае **загадчык кафедры спеваў Акадэміі музыкі Таццяна ЦЫБУЛЬСКАЯ.** — Канешне, часцей за ўсё кандыдаты спяваюць «эстраду» — гэта больш папулярныя, дэмакратычныя, даступны кожнаму шлях, але і тут важна развіваць у сабе асобу, а не капіраваць іншых выканаўцаў. Нікому не патрэбны другія Селін Дзіон, Віктар Цой або Паліна Гагарына. Таму варта імкнуцца быць першым, самім сабой. І нават калі не пашчасціць прайсці цяперашні адбор, трэба не апускаць рукі, а ісці далей, шукаць сябе і верыць у сваю ўдачу — паверце, пры наяўнасці таленту любой велічыні гэта вельмі важны фактар».

## НЕ МУЗЫКАЙ АДЗІНАЙ

Няшмат было сярод сёлетніх кандыдатаў сольных танцораў. «У харэаграфічных гуртках і студыях дзеці ўсё больш займаюцца калектыўна, дабіваюцца зладжанасці рухаў, а гэта майстэрства педагога-харэографа. Нас жа больш цікавіць, як раскрываецца ў мастацтве танца асоба, індывідуальнасць саміх артыстаў, а з гэтым, як высвятляецца, існуе пэўная праблема», — падзяліліся назіраннямі арганізатары.

Ацэньваць творчасць, не маючы адпаведнай мастацкай адукацыі, вельмі цяжка — таму для нас, журналістаў, кандыдаты былі цудоўнымі ўсе без выключэння. Але некаторыя — яшчэ і асабліва кранальнымі, як «хрустальная дзяўчынка» Кіра Ламейка. У Кіры складаны дыягназ — недасканалы остэагенэз, або, прасцей кажучы, павышаная крохкасць касцей, з-за чаго неасцярожныя рухі могуць прывесці да пераломаў, таму яе выступленне стала ўзорам не столькі мастацтва, колькі жыццялюбства і сілы духу...



У трэці дзень адбору Акадэмію музыкі зноў запоўнілі ўсхваляваныя школьнікі — музыканты-інструменталісты з педагогамі і канцэртмайстрамі. У адных за плячыма — футаралы з акардэонамі, другія карыстаюцца «тутэйшымі» цымбаламі і фартэпіяна. «У маім дзяцінстве большасць чаргі складалася б з гітарыстаў, а сёння, здаецца, наогул ніводнага няма», — крыху сумна заўважае калега-тэлевізійнік. Мы таксама хлопчыкаў і дзяўчат з гітарамі не заўважылі — затое паслухалі разам з суддзямі шэраг класічных і джазавых, старадаўніх і сучасных твораў у выкананні гарманістаў, піяністаў, флейтыстаў, майстроў цымбалаў і мандаліны. Дарэчы, у гэтай намінацыі амаль не было выпадковых удзельнікаў — дзяцей, якія займаюцца музыкай па волі бацькоў. Музычны стаж большасці юных кандыдатаў прыемна ўразіў: у 10—15-гадовым узросце практычна ўсе яны вучацца ў музычных школах і асвойваюць любімыя інструменты па 6, 8, 9 гадоў. Зрэшты, як пацвердзіла ўласным прыкладам вучаніца гродзенскай спецшколы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку Насця Гуранкова, нават калі конкурсны «паслужны спіс» і вопыт у цябе яшчэ маленькі, а любоў да музыкі — вялікая, добрыя вынікі не прымусяць сябе чакаць...

Безумоўна, адным з самых уражлівых і эмацыянальных стаў заключны дзень кастынгу, на які запрашаліся юныя дэкламатары, акцёры, комікі, фокуснікі, цыркавыя гімнасты ды іншыя прадстаўнікі арыгінальнага жанру. Тут нас таксама чакаў шэраг дзіўных адкрыццяў: напрыклад, адна школьніца нечакана выбрала для мастацкага чытання верш «Камсамольскі білет» Аркадзя Куляшова, а другі, маленькі хлопчык, чытаў вершы пра каханне — і так расчуліўся, што сам заплакаў...

Наогул, як адзначае **рэктар Акадэміі музыкі, старшыня рады Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі Кацярына ДУЛАВА,** якая ўжо другі год уваходзіць у журы праекта, стаўленне юных артыстаў да конкурсу стала больш адказным: «Конкурс набірае абароты, значыць, ён будзе больш моцны і цікавы для гледачоў і больш сур'ёзны для саміх удзельнікаў — у кожнага з іх мусіць быць пэўны конкурсны вопыт, упэўненасць у сваіх сілах, а таксама павінна прысутнічаць харызма, адчувальная літаральна з першых імгненняў на сцэне. Асабіста мяне, прызнаюся, на фоне мноства «копій» з папулярнага мастацтва некаторыя ўдзельнікі парадавалі — гэта не толькі таленавітыя дзеці, але і неверагодна аптымістычныя, жывыя, яркія, якія, я ўпэўнена, добра сябе пакажуць».

Літаральна праз тыдзень 48 з амаль 500 прэтэндэнтаў атрымаюць «шчаслівыя білецікі» ў тэлепраект і прыступяць да рэпетыцый, а ўжо напачатку лістапада «Талент краіны—2» выйдзе ў эфір. Каму з яго ўдзельнікаў сёлета дастанецца тытул пераможцы і галоўны прыз — грант Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі? Сачыце за эфірам — і ўбачыце!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*Больш фота глядзіце на нашым сайце www.zviazda.by*

### *Даведка «Звязды»*

*Першы агульнарэспубліканскі дзіцячы тэлевізійны конкурс «Талент краіны», зладжаны сумесна тэлеканалам АНТ, Спецыяльным фондам Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, Міністэрствам культуры і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі, стартаваў летась. З некалькіх сотняў кандыдатаў было адабрана 48 удзельнікаў у дзвюх узроставых групах: 5—10 і 11—15 гадоў, якія выступалі ў чатырох творчых намінацыях: вакальнае мастацтва, харэаграфія, інструментальнае мастацтва і арыгінальны жанр (уключаючы дэкламацыю, акцёрскае майстэрства, цыркавое мастацтва). Пераможцамі першага сезона сталі два юныя піяністы: Сафія Курловіч з Салігорска і мінчанін Мікіта Шастакоў.*

*Другі сезон праекта ладзіцца па падобнай схеме: 48 удзельнікаў і ўсяго 7 канцэртаў, каб найбольш ярка раскрыць свае здольнасці перад суддзямі і гледачамі. Абавязкова захаваецца ў «Таленце краіны—2» традыцыя выступлення ў кожным канцэрце спецыяльных гасцей — адораных дзяцей, якія апынуліся ў складаных жыццёвых абставінах.*




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.


## «СМАК ЖЫЦЦЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 9 кастрычніка 2017 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**

**Сярод падпісчыкаў 12.10.2017 года будуць разыграны 7 вяндлярняў электрычных «ТэрмМікс» і суперпрыз — Маразільнік Indesit. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22.10.2017 года.**

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31.12.2017 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» чытайце ў нумары 171 газеты «Звязда» ад 06.09.2017 года.**

**Тэлефон для даведак (017) 337 44 04.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 7.09.2017 да 31.12.2017.**

**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3087 ад 04.09.2017 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**



МАРАЗІЛЬНІК Indesit SFR 100



Вяндлярня электрычная суцэльнаметалічная «ТэрмМікс»

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)

на IV квартал або II паўгоддзе 2017 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ______ (індэкс)

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

## Серада, 13 верасня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х (16+).
**9.10, 10.05, 22.00** **Серыял «След». (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар. (6+).
**11.35, 12.10, 20.00** **Меладрама «Любімая настаўніца». (16+).**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 15.25, 16.30** **Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 18.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.20** **Драма «Помста». (16+).**
**11.15** «Нераскрытыя тайны». (12+).
**12.25** «Багіня шопінгу». (16+).
**13.00, 20.30** «Бітва салонаў». (16+).
**14.00** «Паненка-сялянка». (16+).
**15.20, 23.50** **Серыял «Іх перабылталі ў раддоме». (16+).**
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05** **Серыял «Шалёны анёл». (12+).**
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1-ы тур групавога раўнду. «Шахцёр» (Данецк, Украіна) — «Напалі» (Неаполь. Італія).
**0.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1-ы тур групавога раўнду. Агляд гульнявога дня.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.50** «Беларуская кухня». Бульба з сушанай рыбай.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 23.10** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40** **«Людміла Гурчанка». Драма. (12+).**
**9.10, 14.45** **«Пайсці і не вярнуцца». Драма. 1-я серыя. (12+).**
**10.30** «СССР — музыка пад забаронай». Аляксандр Разенбаўм (12+).
**10.55** «Камертон». Рэжысёр Гродзенскага тэатр лялек Алег Жугжда.
**11.20, 18.05** «Апошні дзень». Клара Лучко (12+).
**12.20** «Загадкі дзеда Кандрата». Народны пісьменнік Беларусі Кандрат Крапіва (6+).
**12.45** Канцэрт вакальнай групы «Чысты голас».
**14.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**16.00, 21.05** «Гісторыя міліцыі ў асобах». «Ліхія 90-я» (12+).
**16.25, 21.30** **«У цяжкую гадзіну». Драма. (12+).**
**19.30** «Запіскі на палях». Адам Міцкевіч.
**20.10** «24 пытанні». Уладзімір Грыдзюшка (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Клімат. Апошні прагноз». Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1-ы тур. «Бенфіка» (Лісабон, Партугалія) — ЦСКА (Масква, Расія).
**9.55** Спорт-кадр.
**10.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1-ы тур. «Барселона» (Іспанія) — «Ювентус» (Мілан, Італія).
**12.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1-ы тур. Агляд гульнявога дня.
**12.55** Хакей. КХЛ. «Югра» (Ханты-Мансійск) — «Авангард» (Омская вобл.).
**15.00** «Нашы трэнеры. Андрэй Скабелка».
**15.15** Час футбола.
**16.00** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**18.05** Козел пра футбол.
**18.25** Слэм-данк.
**18.55, 23.55** Спорт-цэнтр.
**19.05** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Лада» (Тальяці). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1-ы тур. Анлайн гульнявога дня (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.20** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10** «Давай пажэнімся!» (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55, 0.00** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** **Серыял «Камісарша» (12+).**
**23.00** **Серыял «Яўлампія Раманава-2. Следства вядзе дылетант» (16+).**
**0.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.25** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**11.50** **«Студэнты». Серыял (16+).**
**13.50** «Тэрыторыя памылак» (16+).
**15.30** «Грошы не пахнуць». (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** **«Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.45** **«Белыя ваўкі». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 5.15** М/ф (0+).
**7.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00, 13.15** **Серыял «Развод». (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25, 2.50** «Іншы свет». (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**16.15** **Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**19.20** **Серыял «Аддзел 44». (16+).**
**23.10** **Маст. фільм «Бабанькі» (16+).**
**1.00** **Маст. фільм «Забарона» (16+).**
**4.10** **Маст. фільм «Новы Гулівер» (0+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 20.40** **Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** **Серыял «Сваты». (16+).**
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.10, 23.10** **Серыял «Чорная кроў». (12+).**
**0.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05** **Серыял «Таксістка». (16+).**
**8.55** **Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.15** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25** **Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.30** **Серыял «ППС». (16+).**
**17.20** **Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45** **Серыял «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы». (16+).**
**21.25** **Серыял «Жонка паліцэйскага». (16+).**
**23.35** «Вынікі дня».
**0.05** **Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.10, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**8.15** **Серыял «Я буду чакаць цябе».**
**9.00, 16.30** **Серыял «Сага аб Фарсайтах».**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00** **Драма «Лютасць» (16+).**
**13.10** **Дэтэктыў «Адна смерць на дваіх».**
**15.00, 17.45** **Серыял «Канвой».**
**18.40** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**19.15** **Драма «Грэшнік» (12+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** **Драма «Кіроўца для Веры» (16+).**
**23.05** **Серыял «Джо».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**6.30, 15.20** Серыял «Вароніны». (12+).
**8.00, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.35, 4.55** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**9.00, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30, 19.00** Серыял «Маладзёжка-5». (12+).
**10.30** Баявік «Лара Крофт: раскрадальніца грабніц. Калыска жыцця». (12+).
**12.40** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.10** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**14.15, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.50** Серыял «Прынц Сібіры». (16+).
**17.50, 23.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Кракадзіл Дандзі». (12+).
**0.00** Серыял «Тут хтосьці ёсць...» (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.00** «Лаві момант». (16+).
**2.20** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).
**5.10** Серыял «Амазонкі». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** Хто ў доме гаспадар.
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Расціслаў Плят.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05, 21.50** «Правілы жыцця».
**8.35, 22.20** «Кацярына». Серыял.
**9.15** «Пешшу...» Масква Савы Марозава.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.15, 0.30** ХХ стагоддзе. «Відавочнае — неверагоднае». 1976 год.
**12.20** «Магістр гульні». «ШтО застаецца Гамлету...»
**12.45** «Еган Кеплер». Дак. фільм.
**12.55** Штучны адбор.
**13.35** «Нерон: у абарону тырана». Дак. фільм.
**14.30** Да 70-годдзя з дня нараджэння Івана Саутава. «Паедзем у Царскае Сяло». «Чарлз Камерон».
**15.10, 1.30** Расійскія «Зоркі сусветнай оперы». Кацярына Семянчук.
**15.45** «Каханне і больш, чым каханне». Дак. фільм.
**16.45** «Блізкае акружэнне Авангарда Лявонцьева».
**17.35** Сусветныя скарбы.
**17.50** «Холад». Дак. серыял.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Ступені цывілізацыі. «Траянскі конь: міф або рэальнасць?» Дак. фільм.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.10** «Абсалютны слых».
**23.00** «Гістарычныя падарожжы Івана Талстога».
**23.45** «Анґел». Маст. фільм.
**2.05** «Каханне і больш, чым каханне». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Дом, які пабудаваў Свіфт». (16+).
**8.15, 9.40, 11.00, 11.35, 13.05, 15.40, 17.00, 17.35, 18.40, 20.40, 21.40, 23.00, 23.35, 1.35, 5.25** Музычная настальгія. (12+).
**08.30** «Ранішняя пошта». 1986 год. (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час». (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**11.25, 17.25, 23.25** «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2005 год. (16+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Куды з'ехаў цырк?» 2006 год. (12+).
**13.25** Тэлеспектакль «Малыш і Карлсан, які жыве на даху». 1971 год. (6+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Натальляй Казялковай: Тэма: «Юрый Візбар». 2004 год. (12+).
**18.50** Маст. фільм «Калі верыць Лапатухіну...» (16+).
**0.00** Фільм-спектакль «Таблетку пад язык». 1978 год. (12+).
**1.55** Фільм-канцэрт «Рыкі Э Поверы». 1986 год. (12+).

### EuroSport 1

**3.00** Маст. фільм «Позняе каханне». 1-я серыя. (16+).
**4.00, 9.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**5.30, 7.00, 10.30, 1.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**7.30, 23.00** Тэніс. US Open.
**8.30, 15.00, 0.00** Веласпорт. «Вуэльта».
**11.00, 19.00** Алімпійскія гульні. «Зала Славы». Афіны — 2004.
**12.00, 20.00** Алімпійскія гульні. «Зала Славы». Пекін — 2008.
**13.00, 21.00** Алімпійскія гульні. «Зала Славы». Лондан — 2012.
**14.00** Алімпійскія гульні. «Зала Славы». Рыа — 2016.
**16.00, 22.15** Веласпорт. «Гран-пры Валоніі».
**18.00** Алімпійскія гульні. «Зала Славы». Сіднэй — 2000.

### Кінакамедыя

**0.30** Камедыя «Як па масле». (16+).
**2.05** Камедыя «Нянькі». (16+).
**3.40** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы». (12+).
**05.15** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!» (12+).
**7.00** Камедыя «Кухня ў Парыжы». (16+).
**8.50** Меладрама «Анж і Габрыель». (16+).
**10.25** Камедыя «Нянька па выкліку». (16+).
**12.05** Камедыя «Вундэркінды». (16+).
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**16.10** Камедыя «Кур'ер з раю». (12+).
**17.45** Меладрама «Домік у сэрца». (16+).
**19.30** Камедыя «Хованкі». (16+).
**21.25** Камедыя «Самка». (16+).
**22.50** Камедыя «Прыгоды Падынгтана». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.20** «Доктар І...» (16+).
**8.50, 19.00, 3.25** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
**10.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.15** «Сляпая» (12+).
**13.15** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 5.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**17.05** «Адкрыта» (12+).
**18.00** «Парфюмерка-2». Серыял (16+).
**21.00** «Магазіна» (16+).
**22.05** «Рэвізора» (16+).
**23.10** «Лінія абароны» (16+).
**23.40** «Легенда пра Шукальніка». Серыял (16+).
**0.25** «Дзявятыя вароты». Фэнтэзі (16+).
**2.35** «Жанна, пажані» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.40** Іншапланецянін (6+).
**8.30** Ужо хто б гаварыў-2 (12+).
**10.20** Чалавек, які змяніў усё (16+).
**13.15** Кіт (16+).
**15.25** Хоць раз у жыцці (16+).
**20.10** Рымскія спатканні (16+).
**22.10** Ужо хто б гаварыў-3 (12+).
**0.05** Монстр (18+).
**2.15** Яна яго абажае (16+).
**4.20** Усё магу! (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Дзённік яго жонкі (16+).
**8.20** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**10.25** Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
**12.15** Старое добрае кіно. Утаймавальнікі веласіпедаў (12+).
**13.45** Стылягі (16+).
**16.20, 4.20** Як выйсці замуж за мільянера-2. Серыі 9—10 (12+).
**18.20** Іван (6+).
**20.20** Вясельнае кіно. Выкрутасы (12+).
**22.20** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
**0.20** Варашылаўскі стралок (16+).
**2.20** Трымай удар, дзетка (12+).

### National Geographic

**6.00, 20.15** Гульні розуму. (12+).
**7.35, 14.10, 22.55, 5.35** Навукова недарэчнасці. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05** Ледзяная дарога. (12+).
**9.35** Астана: горад будучыні. (12+).
**11.50** Аўта-SOS. (12+).
**12.35** Пачатак. (12+).
**13.25, 17.10** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**15.40** Погляд знутры. (12+).
**16.25, 19.30, 0.05, 2.25** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Дзікі тунец. (12+).
**18.45, 21.50, 1.40, 4.45** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас. (16+).
**22.35** Код небяспекі. (12+).
**23.20, 3.10** Паранармальнае. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Харчовая фабрыка. (6+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Балтфлот. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00, 13.30** Скарбы з каморкі. (12+).
**14.00** Гандляры космасам. (12+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Скаваныя. (16+).
**0.00** Узрываючы гісторыю. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (16+).
**2.55** Інжынерныя пралікі. (12+).
**5.30** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Важна цвяроза ацэньваць сілы і не ствараць сабе перагрузкі на працы. Звярніце ўвагу на свой знешні выгляд, намаганні не прападуць дарма, і вас абавязкова заўважаць і ацэняць. У сераду сустрэча са старым сябрам, якую вы даўно адкладалі, нарэшце адбудзецца і прынясе задавальненне. У пятніцу аб'ектыўных цяжкасцяў не пазбегнуць, але вам будзе пад сілу вырашэнне бягучых задач і жыццёвых праблем. Толькі не варта чакаць у гэты дзень асаблівых поспехаў ад камандзіровак, перамоў і выступленняў. У нядзелю будзьце разумныя і эканомныя.



**ЦЯЛЕЦ.** На працягу тыдня, верагодна, давядзецца шмат часу прысвяціць вырашэнню асабістых праблем. Панядзелак і пятніца могуць стаць вельмі дынамічнымі днямі, разнастайныя падзеі будуць змяняцца, як у калейдаскопе. Спатрэбіцца ўся ваша рашучасць і шпаркасць рэакцыі. Старайцеся спецыяльна не шукаць перамен, прыслухайцеся да інтуіцыі. Калі вы ў эмацыянальным парыве не нагаворыце лішняга, то можа з'явіцца добры шанц для службовага росту. Начальства можа падтрымаць вашы новыя ідэі. Найбольш спрыяльным днём на гэтым тыдні будзе нядзеля, неспрыяльным — чацвер.



**БЛІЗНЯТЫ.** Надыходзіць удалы час. На гэтым тыдні вас чакае прыліў сіл і добрая працаздольнасць, у дзелавым і творчым партнёрстве справы пойдуць на лад. Але ва ўсім неабходна ведаць меру, каб блізкія людзі, ды і вы самі не пакутавалі ад імкнення ўсе сілы аддаваць працы. Вы цалкам здольныя змяніць ход падзей, змякчыць вострыя вуглы. Варта праявіць вытрымку і цярпенне.



**РАК.** Панядзелак і аўторак схіляюць да гарманізацыі адносін з начальствам. У пачатку тыдня непажадана адхіляцца ад вызначаных мэт, якімі б вялікімі ні былі спакусы. У вас можа з'явіцца жаданне быць наперадзе ўсіх, і для гэтага будзе шмат шанцаў. Аднак лепш не вылучацца, калегі і сябры гэта ацэняць. Чацвер і пятніца будуць напоўнены прыемнымі навінамі і плённым супрацоўніцтвам з кіраўніцтвам. Паспрабуйце ўдзяліць блізкім людзям дастаткова ўвагі ў выхадныя.



**ЛЕЎ.** Час хоць бы злёгку абнавіць свой імідж, гэта будзе спрыяць кар'ернаму прасоўванню. Сканцэнтруйце ўвагу на рабоце, магчыма раптоўная павелічэнне нагрузкі, з'яўленне новых абавязкаў. Серада — спрыяльны дзень для асваення новых далячынь. У пятніцу зможаце праявіць творчы бок вашай натуры, што дапаможа ўвасобіць у жыццё самыя неардынарныя задумы. У суботу вас можа наведаць выдатная ідэя ў галіне фінансаў. Смела яе рэалізуйце!



**ДЗЕВА.** Адно з самых хвалюючых пытанняў для вас — гэта пытанне кар'еры. Неабходна вызначыцца, чаго вы хочаце ад жыцця. Паспрабуйце змяніць сістэму каштоўнасцяў і ўбачыце, як зменіцца ваша ўспрыманне свету. Дапамагайце навакольным, але не ўзвальвайце ўсе праблемы на сябе. Прадэманструйце сваю прывабнасць у коле сяброў. Наведайце культурнае мерапрыемства, якое ўзбагаціць вас новымі ўражаннямі.

# Прывітанне, прыехалі!

## Экстрэмальныя канікулы для добраахвотнікаў зладзіў тэлеканал «Беларусь 2»

**У канцы 2015 года, калі фінішавала папулярнае беларускае рэаліці-шоу «Панаехалі» — першы праект, у якім вёска і горад на 100 працэнтаў злучыліся, каб даць сучасным маладым людзям экспрэс-урокі школы жыцця, гледачы захапляліся сілай духу гарадскіх «мажораў», якія пераадолелі сябе і навучыліся прыкладваць рукі да справы.**



І, вядома, абсалютная большасць была ўпэўнена, што другі раз падобны нумар не пройдзе і нават самыя наіўныя «дзеці асфальту» больш не клюнуць на вудачку тэлевізійнікаў. Але ўсё аказалася зусім не так, што і пацвердзіла гучная прэм'ера сезона — захапляльнае тэлешоу «Панаехалі-2. Канікулы ўсляпую», якое стартавала 5 верасня на тэлеканале «Беларусь 2».

Нагадаем, два гады таму арганізатары шукалі маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў — хлопцаў і дзяўчат, — якія прывыклі да гарадскога камфорту і не ўяўлялі свайго жыцця без пасядзелак з сябрамі ў кавярнях, тусовак у клубах, модных гаджэтаў, ды што там — без электрычнасці, цёплай прыбіральні і водаправода. Свае заяўкі на кастынг даслалі тысячы кандыдатаў, перакананыя, што гаворка ідзе пра прыгоды ў экзатычнай краіне. А ў выніку дзесяць удзельнікаў апынуліся... у вёсцы пад Валожынам, дзе вучыліся самым простым, зямным рэчам: сячы дровы, палоць грады, касіць траву, даіць кароў, даглядаць пчол, стрыгчы авечак, збіраць ураджай і г. д. Пераможцай праекта, абышоўшы дужы пол, стала дзяўчына — мінчанка Алена Кірынюк, якая паспяхова пераадолела ўсе выпрабаванні і складанасці вясковага жыцця і выйграла пуцёўку на дваіх на Канарскія астравы.

І вось у гэтым годзе вясной і летам Белтэлерадыёкампанія абвясціла кастынг удзельнікаў для новага тэлепраекта. Самыя пільныя, магчыма, западозрылі, што на ўвазе маецца працяг рэаліці-шоу «Панаехалі!», аднак усе падрабязнасці арганізатары трымалі ў сакрэце, таму, напэўна, ніхто нічога не ведаў.

Падчас адбору, які, дарэчы, праходзіў па скайпе, 13 найбольш яркіх, амбіцыйных і энергічных маладых людзей з розных куткоў Беларусі пачулі «так». Далей блогеры, студэнты, маркетолагі, фатограф, мадэль, офісныя работнікі і фрылансеры мусілі выйсці з сеціва і выканаць шэраг заданняў пад кіраўніцтвам вядучага, аднаго з фіналістаў праекта «Панаехалі» Дзмітрыя Савіна: абудзіць у сабе пачуццё прыгожага — у майстэрні скульптара, фантазію і крэатыў — у фотамайстэрні і басейне, уменне трымацца перад камерай — у тэлевізійнай студыі (фінальны этап кастынгу якраз быў паказаны ў першым выпуску шоу 5 верасня, таксама яго можна знайсці на афіцыйных старонках праекта ў інтэрнэце).

«Падрыхтавацца да выпрабаванняў, якія мы прапануем, загадзя немагчыма», — паабяцалі арганізатары рэаліці-шоу і даставілі дзясятку адабраных удзельнікаў на... базу МНС, дзе праходзяць трэніроўкі ратавальнікаў. Працяг канікулаў усляпую інтэрнэт-персанажаў у рэальным свеце гледачы ўбачаць ужо 12 верасня — і далей кожны аўторак удзень ці ўвечары.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Пятніца, 15 верасня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х (16+).
**9.10, 10.05 Серыял «След». (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар. (6+).
**11.40, 12.10, 20.00 Серыял «Зводныя сёстры». (12+).**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 15.25, 16.35 Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы. (6+).
**22.00 Меладрама «Экспрэс-камандзіроўка». (12+).**
**1.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 18.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.50 Драма «Помста». (16+).**
**11.15** «Шыфры нашага цела». (12+).
**12.10** Два рублі.
**12.30** «Багіня шопінгу». (16+).
**13.05, 21.05** «ЛавЛавCar». Трэвел-шоу (16+).
**14.05** «Паненка-сялянка». (16+).
**15.20 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05, 0.15** «Нераскрытыя тайны». (12+).
**17.35 Серыял «Шалёны анёл». (12+).**
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў». 14-ы сезон. (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Дамашні сыр.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.20, 14.35** «Гэты дзень».
**8.25, 18.45 «Людміла Гурчанка». Драма. (12+).**
**9.10, 14.40 «Свята». Драма. (12+).**
**10.40** «Паэт у дарозе». Народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка (6+).
**11.00** «Камертон». Мастак-керамiст Валерый Калтыгін.
**11.25, 18.05** «Апошні дзень». Аркадзь Вайнер (12+).
**12.25** «Эпоха». Адам Міцкевіч.
**13.15** «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Бэла Масумян.
**14.05** «Сіла веры».
**16.10, 21.05** «Гісторыя міліцыі ў асобах». «Летапіс»(12+).
**16.50, 21.45 «Скрадзены цягнік». Драма. (12+).**
**19.30** «Запіскі на палях». Максім Багдановіч.
**20.10** «24 пытанні». Аляксандр Сідарэнка (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.05** «Час кіно».
**23.10 «Басейн». Меладрама. (16+).**

### Беларусь 5

**7.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1-ы тур. «Црвена Звезда» (Белград, Сербія) — БАТЭ (Барысаў).
**9.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1-ы тур. «Капенгаген» (Данія) — «Лакаматыў» (Масква, Расія).
**11.30** Авертайм.
**12.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1-ы тур. «Арсенал» (Англія) — «Кёльн» (Германія).
**14.00** Тэніс. Кубак Дэвіса. Плэй-оф сусветнай групы. Матчы адзіночнага разраду. Швейцарыя — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**18.15, 0.05** Пляжны футбол. Еўраліга. Суперфінал. Беларусь — Італія.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Аўтамабіліст» (Екацярынбург). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Борнмут» — «Брайтан». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!» (12+).
**10.15** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10** «Давай пажэнімся!» (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15** «Час пакажа» (16+).
**16.20 Камедыя «Джэнтльмены ўдачы» (12+).**
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон (12+).
**23.00** «Вячэрні Ургант» (16+).
**23.50 Камедыя «Моцны арэшак» (12+).**
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.25** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50 «Студэнты». Серыял (16+).**
**13.50** «Дзіўная справа» (16+).
**15.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца».
**17.10** «Ведай нашых!» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Уся праўда пра сапраўдных ведзьмакоў» (16+).
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.45 «Белыя ваўкі». Серыял (16+).**
**2.20** «Апантаныя: доказы д'ябла» (16+).

### МІР

**6.00** М/ф (6+).
**6.55** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота» (12+).**
**10.00, 13.15, 2.10 Серыял «Развод». (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет». (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**19.20 Серыял «Тамарка». (16+).**
**23.30 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» (12+).**
**1.10** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**1.40** «Кашмар вялікага горада» (16+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35 Серыял «Сваты». (16+).**
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.10, 23.10** Юбілейны канцэрт Філіпа Кіркорава на «Новай хвалі». (16+).

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Таксістка». (16+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45, 23.15** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «НЗ. Расследаванне». (16+).
**14.25 Маст. фільм «Майстар» (16+).**
**16.30 Серыял «ППС». (16+).**
**17.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы». (16+).**
**23.35 Серыял «Марскія д'яблы». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**8.45 Серыял «Я буду чакаць цябе».**
**9.35, 16.50 Серыял «Сага аб Фарсайтах».**
**10.45** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**11.00 Мюзікл «Стылягі» (16+).**
**13.20 Дэтэктыў «Той, хто гасіць святло».**
**14.55, 18.00 Серыял «Карона».**
**16.00** «Мультпарад».
**16.20** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**19.05 Трылер «Прэзумпцыя віны» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Непрыстойная прапанова» (16+).**
**23.05 Серыял «Джо».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**6.30, 15.20** Серыял «Вароніны». (12+).
**8.00, 4.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.35, 4.55** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**9.00, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Маладзёжка-5». (12+).
**10.30** Камедыя «Кракадзіл Дандзі-2». (12+).
**12.40** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.10** «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
**14.15** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.50** Серыял «Прынц Сібіры». (16+).
**17.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**20.20** Фантастыка «Дывергент». (12+).
**23.00** Жахі «Праклятыя. Супрацьстаянне». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.00** «Лаві момант». (16+).
**2.20** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).
**5.10** Серыял «Амазонкі». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 0.10** Навіны культуры.
**6.35** Хто ў доме гаспадар.
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Чарлз Спенсер Чаплін.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05** «Расія, любоў мая!» «Галаўныя ўборы народаў Расіі».
**8.35** «Больш, чым каханне». Таццяна Пельтцэр і Ганс Тэйблер.
**9.15** «Пешшу...» Масква Высоцкага.
**9.40** Галоўная роля.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Сільва». Маст. фільм.
**11.55** «Губерт у «Краіне цудаў». Дак. фільм.
**12.55** «Георгій Менглет. Лёгкі талент». Дак. фільм.
**13.35** «Імператарскі палац у Кіёта. Прыгажосць, непадуладная часу». Дак. фільм.
**14.30** Да 70-годдзя з дня нараджэння Івана Саутава. «Паедзем у Царскае Сяло». «Я жанаты і шчаслівы».
**15.10** Расійскія «Зоркі сусветнай оперы». Гала-канцэрт ІІ Міжнароднага музычнага фестывалю Дзінары Аліевай «Opera Art».
**16.50** «Пісьмы з правінцыі». Кургальскі паўвостраў.
**17.20** Геніі і ліхадзеі. Мікалай Гамалея.
**17.50** «Дзённы цягнік». Маст. фільм.
**19.45** Сусветныя класічныя хіты. Гала-канцэрт у Храма Хрыста Збавіцеля.
**21.20** «Лінія жыцця». Ігар Вернік.
**22.20** Кіно на ўсе часы. «Дуэлянты». Маст. фільм.
**0.25** «Блакітныя Гаваі». Маст. фільм.
**2.05** «Шукальнікі». «Лёнька Панцялееў. Канец легенды».
**2.50** «Па-за гульнёй». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Натальляй Казялковай: Тэма: «Юрый Візбар». 2004 год. (12+).
**6.40, 8.15, 9.40, 11.00, 11.35, 14.25, 15.40, 17.00, 19.05, 20.35, 21.40, 23.00, 1.05, 3.40, 5.00, 5.35** Музычная настальгія. (12+).
**6.50** Маст. фільм «Калі верыць Лапатухіну...» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час». (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**11.25, 5.25** «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2005 год. (16+).
**12.00** Маст. фільм «Не бойся, я з табой». (16+).
**17.10** «У гасцях у Мусліма Магамаева». Фрэнк Сінатра. 1992 год. (12+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1992. 1-я частка. 2010 год. (16+).
**19.20** Маст. фільм «Аферысты». (18+).
**22.00** «Колба часу». (16+).
**23.40** Маст. фільм «Субота і нядзеля...» (12+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Куды з'ехаў цырк?» 2006 год. (12+).
**1.25** Тэлеспектакль «Малы і Карлсан, які жыве на даху». 1971 год. (6+).

### EuroSport 1

**4.00, 12.30** Веласпорт. «Вуэльта».
**05.00, 10.30, 0.30** Веласпорт. Нацыянальны чэмпіянат.
**6.00, 11.30, 1.30** Веласпорт. Класіка.
**7.00, 21.30** Тэніс. US Open.
**8.00, 22.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**9.30** Watts.
**10.00, 0.00** «Гісторыі спартсменаў».
**13.30, 17.00** Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат Еўропы.
**20.00, 2.30** Веласпорт. «Гран-пры Валоніі».

### Кінакамедыя

**00.30** Камедыя «Кухня ў Парыжы». (16+).
**2.25** Камедыя «Загадана жаніць». (16+).
**4.10** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**05.20** Камедыя «Шпіён па суседстве». (12+).
**7.00** Камедыя «Нянька па выкліку». (16+).
**8.40** Камедыя «Вундэркінды». (16+).
**10.30** Камедыя «Хованкі». (16+).
**12.25** Камедыя «Газелі». (16+).
**14.15** Камедыя «Піжон». (16+).
**16.00** Камедыя «Снежны анёл». (12+).
**17.55** Камедыя «Трое і Сняжынка». (16+).
**19.30** Камедыя «Высокі бландзін у чорным чаравіку». (12+).
**21.05** Камедыя «Блеф». (16+).
**23.00** Камедыя «Паслявясельны разгром». (18+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.15** «Доктар І...» (16+).
**8.45** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
**10.30, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15** «Паралельны свет» (12+).
**15.15** «Трэндзі» (16+).
**15.45** «Здзелка» (16+).
**16.15, 2.15** «Рыжыя» (16+).
**17.15, 5.15** «Людзі пятніцы» (16+).
**18.10, 1.25** «Бітва салонаў» (16+).
**19.10, 0.35** «Жанна, пажані» (16+).
**20.10** «Знаёмства з Факерамі». Камедыя (12+).
**22.15** «Савецкія мафіі» (16+).
**23.00** «Вока». Маст. фільм (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Ціхая гавань (12+).
**8.25** Дракула (16+).
**10.50** Воблачны атлас (18+).
**14.05** Кіт (16+).
**16.00** Поўнымі грудзьмі (16+).
**20.10** Таксі-4 (12+).
**22.10** Тайнае акно (12+).
**0.10** Сем'янін (12+).
**2.25** Чалавек, які змяніў усё (16+).
**4.40** Ужо хто б гаварыў-2 (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Ключ ад спальні (12+).
**8.55** Аднакласніцы (16+).
**10.25** Артыстка (12+).
**12.20** Старое добрае кіно. Трое ў лодцы, калі не лічыць сабаку. (12+).
**14.50** Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
**16.20, 4.20** Мачаха. Серыі 1—2 (12+).
**18.20** Пах верасу (16+).
**20.20** Вясельнае кіно. Аднакласніцы: новы паварот (16+).
**22.00** Географ глобус прапіў (16+).
**0.20** Агні прытона (16+).
**2.30** Дзённік яго жонкі (16+).

### National Geographic

**6.00, 13.25, 20.15** Гульні розуму. (12+).
**7.40** Зрабі або памры. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05** Ледзяная дарога. (12+).
**9.35, 16.25, 19.30, 0.00, 2.20** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**11.50** Аўта-SOS. (12+).
**12.35** Пачатак. (12+).
**14.10, 22.30, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**15.40** Пячора гіганцкіх крышталёў. (6+).
**17.15** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Астана: горад будучыні. (12+).
**18.45, 21.45** 80-е: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас. (16+).
**22.55** Код небяспекі. (12+).
**23.15, 3.05** Паранармальнае. (16+).
**1.35, 4.45** Найвялікшыя трагедыі. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Харчовая фабрыка. (6+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Балтфлот. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** На краі Аляскі. (16+).
**14.00, 19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**20.00** Гандляры космасам. (16+).
**0.00** Вулічная навука. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (12+).
**2.00** Самагоншчыкі. (16+).
**2.55** Мяцежны гараж. (16+).
**5.30** Маланкавыя катастрофы. (16+).




## СЛОВА — НЕ ВЕРАБЕЙ...

Гэта было напрыканцы дзевяностых, мы тады пераходзілі на лічбавыя тэхналогіі, і я паехаў у Мінск у камандзіроўку. Засяліўся там у двухмесны нумар ці не самай высокай сталічнай гасцініцы, у шафу на вяшак акуратна павесіў парадны службовы мундзір — амаль што новенькі, бо на працу ў ім не находзіш, а прафесійнае свята — дзень работнікаў лесу — толькі раз на год...

Помню, што яшчэ палюбаваўся: ля каўняра там — прыгожыя зорачкі, на абшлагах рукавоў — залацістыя палоскі, як у адмірала...

Вечарам у нумар засяліўся яшчэ адзін пастаялец, дзяцюк гадоў трыццаці, без верхніх пярэдніх зубоў. Мы пачалі з ім знаёміцца: распытваць, хто адкуль, чаго ў сталіцы?.. Карацей, звычайныя размовы звычайных людзей, якія сёння выпадкова стрэліся, а заўтра, відаць, назаўжды разыдуцца... Але ж я высветліў, што сусед мой — з Брэстчыны, што ён — былы баксёр, што зубы страціў у выпадковай бойцы, што цяпер працуе ў ахове...

Ні пра баксёраў, ні пра ахову я нічога такога не ведаў. Да таго ж вечар быў восенькі, доўгі, — яго яшчэ трэ было неяк прабавіць... Вось я і ўзяўся распытваць свайго суседа пра тое, пра гэта...

Аднак ён адказваў мне вельмі коратка, стрымана, падалося — без ніякай ахвоты. Ну я і адчапіўся — стаў нешта чытаць.

...Раніцой сусед мой падняўся першы: пайшоў у ванны пакой, прывёў сябе ў парадак, адчыніў шафу. І, відаць, толькі цяпер на левым плячы майго «мундзіра» ўгледзеў значок дзяржаўнай лясной аховы.

— Дык вы не пракурор?! — вылупіў вочы ён: расплыўся ў шырэзнай шчарбатай усмешцы.

— Не...

Чаму ён баяўся пракурораў, я не спытаўся — іншых тэм аж па горла было, бо баксёра панесла, не раўнуючы, як Астапа...

Я тады хіба што слухаў.

**І. Сіманёнак,** *г. Паставы*

## ВЫГАДНАЯ ПАКУПКА

Адбылося гэта ў далёкім 1961 годзе, адразу пасля грашовай рэформы: тады (калі хто помніць) нулік адкінулі, гэта значыць, было ў чалавека дзесяць рублёў — стаў адзін.

Дык вось недзе ў хуткім часе пасля гэтага вяртаюся я са школы і бачу, што ў нас, можна сказаць, госці — маміна сяброўка прыйшла. Прыселі яны ўдзвюх на тапчан і гамонку вядуць.

Я кніжку чытаю, не дужа слухаю, але ж час ад часу ў іх бок пазіраю. Бачу — боты ў цёткі новыя. Да таго ж — нейкія... ненармальныя.

Мама таксама гэта заўважыла, пытае:

— Кацярына, ты што — не на тую нагу абулася?

— Ды не, Мар'ечка, гэта ж я сёння ў Чэрвені была, — здалёк пачынае цётка. — Іду там па вуліцы і заўважаю, што людзі гумовікі аднекуль нясуць. Спыніла адну жанчыну, пытаюся: «Дзе даюць?» Яна кажа: «У краме ўцэненых тавараў». Я туды — куляй... Бачу, народу, як селядцоў у бочцы, бо патрэбны ж тавар і танна: па рублі за бот...

Стала ў чаргу і я: не паверыш, пакуль да прылаўка дайшла, амаль паўдня стрыбіла! А галоўнае — марна: усе парныя боты разабралі, а няпарныя (на правую нагу) засталіся. Дык я давай прасіць прадаўца, каб што-небудзь падабраў мне. Во — узяла (цётка выпрастала ногі, паказала...) — адзін бот якраз, а другі — на тры памеры большы. Надзела іх, патупала, думаю: а халера з ім, добра будзе ў хлеў хадзіць! Выгадная ж пакупка, бо дзе ты яшчэ возьмеш боты па рублі за штуку?

Былі часы, былі абноўкі... Ужо і не верыцца.

**Міхась Мірановіч,** *Кіраўскі раён*

## ВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

...З маіх знаёмых калег-настаўнікаў, мусіць, самым шматдзетным быў Міхаіл Міхайлавіч. Разам з жонкай Лідзіяй Міронаўнай яны гадавалі пяцёра дзяцей. Але ж тут і зараз я раскажу толькі пра малодшую з іх дачок.

Старэйшыя і дочкі, і сыны змалку дапамагалі бацькам: вучыліся і ў печы паліць, і ежу варыць, і сена касіць ды каня запрагаць, і гарод дагледзець, а малодшай, Тамары, было за кім паленавацца. Неўпрыкмет закончыла школу, педвучылішча, выйшла замуж, а з якога боку да каровы падысці, так і не ведала.

Але ж неяк прыязджае дамоў і чуе ад бацькі, што маці дома няма, а карову падаіць трэба (яму неяк няўцям было, што Тамара не ўмее).

Але ж адступаць ёй не было куды: узяла кавалачак хлеба ды хусцінку, каб абвязаць вядро пасля даення, і пайшла на луг, дзе пасвіўся статак. Следам за ёй грамадою рушылі дзеці. Нібы тыя птушаняты, яны шчабяталі побач, гулялі ў «даганялкі». Але Тамара нічога не чула і не бачыла. З яе сем патоў сышло, пакуль прысаджвалася пад карову, пакуль цягала яе за саскі: малако чамусьці зусім не цякло.

Урэшце кінула яна мучыць карову, абвязала вядро хусцінай (каб ніхто не бачыў, што малака там хіба з паўлітра) ды рушыла дамоў. Бацьку нічога не сказала. Маці па-ранейшаму не было — яна прыехала толькі пад вечар.

І тады ж не прыйшла, а прыбегла з поля Зорка, на хаду губляючы малако.

— Мамачка, навучы мяне карову даіць! Хутчэй, — папрасіла дачка, убачыўшы карову.

Аказалася, што даілася іх карміліца і сапраўды цяжка, але ж, асвоіўшы гэту навуку, Тамара паспяхова спраўлялася. І потым у кожны свой прыезд першай бегла да Зоркі.

**Тацццяна Чэкед,** *г. Гомель*

## ДЗВЕ РАБІНАВЫЯ НОЧЫ

Ніхто, думаю, не стане аспрэчваць, што найлепшая пара года — гэта лецейка: сонца, пахі, краскі, спевы жаўрукоў... Адно, што палохае, — дык гэта паведамленні пра аранжавы ўзровень бяспекі. Нешта зачасцілі штармавыя вятры ды навальніцы з перпендыкулярнымі бліскавіцамі: загараюцца ад іх будынкі, падаюць зламаныя дрэвы і слупы, злятаюць дахі з дамоў...

Упершыню гэткі жах я перажыла дзяўчом, гадоў у 12. Ад раскатаў грому тады літаральна закладвала вушы; у хату лілася вада (шыбы выбіла), на вуліцы нешта трашчала і гахкала... Куды было хавацца?

Мы з мамай (светлай памяці!) забіліся пад стол, сядзелі там, як мышы, можа, гадзіны са дзве, а калі выйшлі на вуліцу, то нічога вакол не пазналі: страху з нашай хаты знесла, усе пладовыя дрэвы ляжалі ўверх карэннем, гарод быў заліты, ад пасадак не засталося нічога! (У іншых людзей, дарэчы, таксама... Шчасце яшчэ, што самі ў жывых засталіся...)

Да гутаркі дайшло — расказала сваёй прыяцельцы Ніне Паповай пра гэтую навальнічную ноч, а яна тады прыгадала сваю:

— У нашай вёсцы (кабета з Белавічаў, да нас замуж прыйшла) на першую Прачыстую некалі кірмаш быў, і ў гэты дзень — такая традыцыя — у госці мог з'явіцца хоць хто: сваякі, знаёмыя... Значыць, трэ будзе нечым частаваць, а ў нас з мамай каб кропля гарэлкі... Праўда, брага ёсць і ўжо «адхадзіла».

Што рабіць? У лесе ля суседняй вёскі падпольны заводзік быў: на чатырох камянях вялікая металічная бочка ляжала, у ёй вада награвалася, пара праз трубу выходзіла ў бражнік, потым — у адборнік, з яго — у халадзільнік, а ўжо адтуль гатовая прадукцыя ішла — чыстая, што сляза!

Кіраваў гэтым заводзікам «дырэктар», інвалід вайны, і за «вытворчасць прадукту» ён шмат не браў — хіба першую пляшку.

Вось да яго матуля мяне і адправіла, сталі гнаць. Потым, атрымаўшы плату, «дырэктар» пайшоў дадому, а я засталася...

Адкуль узялася чорная хмара, з чаго пачалася навальніца, зусім не заўважыла! Але так спужалася, што забілася ў гушчар ды думаю: «Усё, мне канец...»

Шчыра малілася, бо вельмі хацела жыць. І можа з гадзіну ці дзве... потым вецер заціх, грымоты, як быццам, таксама, затое... завылі ваўкі!

Ад таго заводзіка да дома было сем кіламетраў. Я іх прабегла, не чуючы ног! А маці вочы праплакала, мяне чакаючы! «Дачушка мая, — казала абдымаючы, — я ж думала, што ты нежывая ўжо... Далася нам тая самагонка! Каб яна спрахла!»

...Гаварыць так можна было, але ж, калі з кірмашу да нас госці завіталі, мама сходзіла да суседзяў і пазычыла ў іх гарэлкі.

**Ніна Бурко,** *г. Беразіно*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

### Неасабісты суб'ектыў

# ІГРУШАВАЕ ВАРЭННЕ



## Пра адну амаль ссохлую дзічку

СЁЛЕТА яблыкаў у вёсцы няма зусім: зрэдку блісне паміж галін ды лісця якая антонаўка, дый тое такімі даждажамі ды вятрамі ўтрымацца на дрэве складана. Урадзіла толькі груша ў маладым садзе, яе салодкія мяккія плады сорту дзюшэс сыпаліся ў траву кожны дзень, вабячы ўсіх навакольных вос, падкіх на такі пачастунак. Атрымаўшы джала ў палец, я ўсё-ткі грушы сабрала і прывезла ў горад — варыць варэнне. Купіла на Камароўцы яшчэ паўлітра брусніц, каб дадаць кіслінкі. Варэнне атрымалася прыгожае — цёмна-бурштынавае, з застылымі скрылікамі і ягадкамі — і смачнае. Але не такое, зусім не падобнае на тое, што варылі з бабулiных дзічак.

ВЯЛІЗНАЕ грушавае дрэва расло каля самага вугла нашай хаты колькі я сябе помню. Колькі я сябе помню, гаспадары думалі пра тое, каб яго спілаваць: вельмі блізка ад страхі, галіны на яе кладуцца, вільгаць ад яго, дый небяспека — рухне такая махіна на хату, дык і кавалкаў не збярэш. Але кожны раз увесну яна пакрывалася суцэльным карункавым белым вэлюмам. А пасля ў прымацаванай на ёй шпакоўні пачынаўся птушыны гармідар і можна было проста з акна бачыць разяўленыя дзюбы шпачанят, у якія клапатлівая маці дзяліла прынесеную здабычу. А пасля на галінах нечакана з'яўляліся цэлыя гронкі зялёных цвёрдых ігрушак, якія ў канцы жніўня ператвараліся ў невялікія, але вельмі салодкія жоўтыя і засыпалі ўсю зямлю ў агародчыку, не давалі спаць ночку, барабанячы па шыферы, павісалі на кустах гашты пад вокнамі... Узімку на дрэве пасяляўся дзяцел і ці не кожны дзень упарта стукаў па ім, і ад гэтай яго ўпартасці было весела і станавілася цяплей нават самай сцюдзёнай парой... Карацей, пілаваць дрэва не было як ні ў якую пару года, яму толькі час ад часу падразалі адросшыя галіны, якія кларыся на дах ці на правады. І яно аддзячвала кожны год: нават у самыя неўраджайныя часы, калі ва ўсім наваколлі не было ні яблычка, наша дзічка духмянымі пладамі засыпала ўвесь агародчык.

Грушу тую пасадзіла ў маладосці, яшчэ, пэўна, да вайны, наша бабуля: дрэва так і звалі ў вёсцы — Аміліна груша. Нашу грушу ведалі ўсе, падчас «збору ўраджаю» ў нашым двары з кашамі перабывалі не толькі аднавяскоўцы — прыходзілі спецыяльна «ў грушы» і маміны калегі са школы, і проста знаёмыя з суседніх вёсак. Хапала ўсім, а ўжо як аб'ядаліся самі! Варылі варэнне, ставілі кампоты, але самая смаката была, калі бабка сыпала грушы на бляху і ставіла ў печ. Яны станавіліся цёмна-карычневымі і зморшчанымі, але на смак здаваліся лепшымі за самыя дарагія цукеркі. А потым у той жа печы грушы сушылі на зіму і па хаце лунаў саладкаваты незабыўны водар, які, пэўна, першым бы і прыгадаўся, калі б хтосьці надумаў спытаць, як пахне шчасце...

НА грушы ніводнай кветкі не было толькі адной вясной — пасля таго, як у лютым пахавалі бабулю. Усе, хто ішоў па вуліцы, здзіўлена пазіралі на непрывычна зялёнае дрэва, успаміналі, што першы год няма яго гаспадыні, ашаломлена хісталі галовамі, прыгаворвалі: «вось ты скажы...» Але налета ў маі дрэва зноў пакрылася суцэльным вэлюмам кветак, і на пачатку восені ў нас у двары зноў было тлумна ад далёкіх і блізкіх суседзяў, якія ішлі збіраць Аміліны грушы.

Праз пару гадоў мы з мамай пасадзілі новы сад — некалькі дубчыкаў яблынь і грушку сорту дзюшэс. Здавалася, калі яны, такія малечы, вырастуць. А вось ужо гады тры тым дзюшэсам частуемся напоўніцу. Яны, канешне, вялікія і духмяныя, зеленаватыя, з крамянымі чырвонымі бакамі, зусім не падобныя на тыя жоўценькія дробныя дзічкі, якімі па-ранейшаму бабчына груша засыпала ўвесь двор. Дзічкі так і заставаліся ляжаць не пазбіранымі, бо ўжо былі нікому не патрэбныя. Не прыходзілі ўжо па іх і аднавяскоўцы — у саміх у садах павырасталі «пародзістыя» дрэвы, дый людзей з кожным годам усё менш і менш застаецца, адны дачнікі, якія ўжо, хоць, здаецца, і свае, але ж крышку чужыя... Летась я бабчыны грушы проста пазграбала металічным венікам у кучу і вынесла на сметнік, каб не гнілі пад вокнамі ды не разводзілі вос і мурашак. Даваліся зрабіць некалькі рэйсаў — ураджай, як заўсёды, быў багаты.

А сёлета бабуліна груша пачала сохнуць. Палова так і не распусцілася пасля зімы, на іншай, што ўсё ж пусціла кволыя лісцікі, не было ніводнай кветкі. Кожныя выхадныя ў жніўні я з надзеяй пазірала на дрэва — а раптам мільгане сярод лісця хоць адна дзічка. Дарэмна — галінкі былі пустыя. Пэўна, увесну грушу давядзецца ўсё ж спілаваць.

ЗРЭШТЫ, бедаваць няма чаго: у маладым садзе вырасла новая. І пладаносіць кожны год, і варэнне з яе пладоў удалае. Але здаецца мне, што ўсё астатняе жыццё Аміліны дзічкі будуць праз гады смачнейшымі, чым той пасаджаны сваімі рукамі дзюшэс.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

З днём нараджэння, з 30-годдзем, шчыра віншую дарагога сына **Уладзіміра РАБЦАВА.** Зычу моцнага здароўя, ладу і згоды ў сям'і, поспехаў у працы!

*Хай будзе год, як колас жыта*
*Цяплом і золатам багаты,*
*А кожны дзень, табой пражыты,*
*Хай будзе радасцю і святам!*

**Ад родных.**



## МУР-ВЕРАСЕНЬ

**У першыя вераснёўскія выхадныя наведвальнікі выставы сустрэлі каля 200 прадстаўнікоў катоў больш чым дваццаці розных парод.**

Вушастыя арыенталы і шатландскія віславухія, гіганты мэйн-куны і выТанчаныя абісінскія кошкі, вядомыя «брытанцы», голыя сфінксы, забіякі корніш-рэксы і многія іншыя. Спецыяльна да восеньскіх свят хлопчыкі і дзяўчынкі змаглі паўдзельнічаць у конкурсе малюнкаў і вырабаў на тэму «Самы дзіўны кот выставы», паспрачацца ў віктарыне на кашэчую тэму і інтэрактыўнай гульні з сапраўднай кошкай «Загадкі ката вучонага». Конкурсная праграма прайшла і для катоў. Выбіралі самага цяжкага, самага выхаванага і самага гаваркога. Традыцыйна на выставе можна было выбраць сабе кацяня, атрымаць кансультацыі ў спецыялістаў па доглядзе за жывёламі.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**



## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 12 октября 2017 г. проводит открытый аукцион с условиями №10-У-17 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на шести земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
